№№30–31
(3160–3161)

26 лютага—1 сакавіка 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

У СУСЕДЗЯЎ

Віктар Януковіч урачыста прысягнуў на вернасць Украіне

"Я, Віктар Януковіч, воляй народа абраны прэзідэнтам Украіны, уступаючы на гэты высокі пост, урачыста прысягаю на вернасць Украіне. Абавязуюся ўсімі сваімі справамі адстойваць суверэнітэт і незалежнасць Украіны, клапаціцца пра блага Айчыны і дабрабыт украінскага народа, адстойваць правы і свабоды грамадзян, выконваць Канстытуцыю Украіны і законы Украіны, выконваць свае абавязкі ў інтарэсах усіх суайчыннікаў, павышаць аўтарытэт Украіны ў свеце". Гэтымі словамі ва Украіне пачаў адлік свайго прэзідэнцтва чацвёрты кіраўнік суверэннай дзяржавы.

Лідэр Партыі рэгіёнаў уступіў на пасаду кіраўніка дзяржавы ў прысутнасці шматлікіх замежных гасцей, у тім ліку і кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Хаця многія СМІ памылкова паведамілі, што Аляксандр Лукашэнка на інаўгурацыю па нейкіх прычынах спазніўся. Непаразуменне тлумачыцца тым, што ў той момант, калі спікер Вярхоўнай Рады Украіны Уладзімір Літвін назваў у ліку гасцей прозвішча Аляксандра Лукашэнкі, тэлевізійныя камеры паказалі пустое крэсла. На самай справе Аляксандр Лукашэнка сядзеў побач з жонкай новага прэзідэнта Украіны Людмілай.

Заступаючы на самую высокую пасаду, спадар Януковіч прынёс прысягу на Евангеллі і Канстытуцыі Украіны, пасля чаго атрымаў ад старшыні Канстытуцыйнага суда пасведчанне прэзідэнта і сімвалы прэзідэнцкай улады — пячатку і булаву.

Дарэчы, другая па колькасці фракцыя украінскага парламента — Блока Юліі Цімашэнка — не прыйшла ў сесійную залу Вярхоўнай Рады, дзе праходзіла інаўгурацыя. Віктар Ющчанка і Леанід Краўчук цырымонію таксама праігнаравалі.

Алена НОВІКАВА.

Першая прамова новага прэзідэнта Украіны

Пасля прыняцця прысягі Віктар Януковіч звярнуўся да прысутных з прамовай, у якой заявіў, што краіна ўступае ў новы гістарычны перыяд. Пры гэтым ён прызнаў, што Украіна павінна вырашаць праблемы каласальных даўгоў, беднасці і карупцыі. "Беднасць, разваленая эканоміка, карупцыя", — так Януковіч ахарактарызаваў абстаноўку ў краіне.

"Першачарговая задача — рэфармаванне сістэмы ўлады і кабінета міністраў, пераўтварэнне яго ў каманду прафесіяналаў", — заявіў пасля Віктар Януковіч.

У міжнароднай палітыцы, па словах новага ўкраінскага прэзідэнта, яго краіна выбярэ такую стратэгію, каб атрымаць максімальныя вынікі ад развіцця роўных і ўзаемавыгадных адносін з Еўрасаюзам, Расіяй і Злучанымі Штатамі.

"Мы гатовы браць удзел у працэсе стварэння і забеспячэння агульнаеўрапейскай бяспекі як еўрапейская пазаблоковая дзяржава", — сказаў Януковіч у сваёй інаўгурацыйнай прамове.

Не прыехалі і не прыйшлі

На інаўгурацыю прэзідэнта Украіны прыбылі 11 кіраўнікоў дзяржаў, чатыры кіраўнікі міжнародных арганізацый, чацвёра кіраўнікоў парламентаў і 15 міністраў замежных спраў. СМІ звярнулі ўвагу на тое, што на мерапрыемстве не прысутнічаў ніводны лідэр з вядучых краін. Расія і многія іншыя краіны, а таксама міжнародныя арганізацыі знізілі да мінімальна прыстойнага ўзроўню сваё прадстаўніцтва на інаўгурацыі. Што тычыцца прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева, дык, як пішуць некаторыя СМІ, ён прамяняў інаўгурацыю Януковіча на перамовы з кіраўніком Лівана, а таксама выдаў указ... за Януковіча — аб правядзенні парада 9 мая ў Севастопалі. Расію прадстаўлялі спікер Дзярждумы Барыс Грызлоў і кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Сяргей Нарышкін.

ДАРЭЧЫ

Адразу пасля інаўгурацыі Віктар Януковіч падпісаў свой першы прэзідэнцкі ўказ. Згодна з ім, Сакратарыят прэзідэнта перайменаваны ў Адміністрацыю прэзідэнта, а колькасць супрацоўнікаў структуры Януковіч даручыў скараціць на 20%.

ІНІЦЫЯТЫВА

Уладзімір Някляеў — за праўду, але ісці ў прэзідэнты не збіраецца...

У Беларусі афіцыйна абвешчана пра старт новай грамадзянскай кампаніі "Гавары праўду!".

Мэта кампаніі заключаецца ў тым, каб беларускае грамадства ўсвядоміла рэальнае становішча ў краіне, дзе мала месца праўдзе і шмат — мане. З заклікам да беларусаў гаварыць праўду звярнуліся вядомыя асобы. Сярод іх паэты Уладзімір Някляеў, Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін, народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка, кандыдат філасофскіх навук Таццяна Процька, акадэмік Радзім Гарэцкі, гросмайстар па шахматах Віктар Купрэйчык і іншыя...

"Няпростая праблема, праз якую мы жывем нібы ў крывым люстэрку, — праблема маны, — гаворыць Уладзімір Някляеў. — Маны бессаромнай, нахабнай, здзеклівай. Маны на ўзроўні ўлады. Татальнай маны, якая стала дзяржаўнай ідэалогіяй. Але праблема не толькі ва ўладзе. Праблема ў грамадстве, часткай якога з'яўляецца ўлада. Ад маны мы сталі бараніцца маной. Нас аслабіла, стачыла мана. Мы перасталі ўсведамляць, хто мы такія. Нам нават хочацца, каб улада хлусіла, — гэта нібы апраўдвае нас. "Ну хто табе праўду скажа?!" — падымаем мы рукі, тым самым адказваючы:"Ніхто!" Гэта духоўная катастрофа. Усведамляючы ману як небяспеку, мы і распачынаем грамадзянскую кампанію "Гавары праўду!".

Першай акцыяй у межах грамадзянскай кампаніі "Гавары праўду!" стаў выпуск незвычайных паштовак. На адваротным баку паштоўкі ўсе жадаючыя могуць напісаць аб самай важнай для сябе праблеме. Паштоўка дойдзе да Адміністрацыі прэзідэнта, бо менавіта адрас "К.Маркса, 38" значыцца на паштоўцы ў адрасатах...

Адзначым, што старт новай кампаніі справакаваў чарговую хвалю чутак вакол асобы Уладзіміра Някляева. Знайшліся людзі, якія падумалі, што Уладзімір Пракопавіч замахнуўся на прэзідэнцкае крэсла. З гэтай нагоды сам Някляеў адказаў катэгарычна: *"Ісці ў прэзідэнты я не збіраюся".*

Ён, мабыць, добра ўсведамляе, што чалавек пенсіённага ўзросту (а яму ўжо пад шэсцьдзесят чатыры) у сённяшняй Беларусі не мае шанцаў стаць прэзідэнтам.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

АКТУАЛЬНЫЙ КОММЕНТАРИЙ

Анатолий ЛЕБЕДЬКО:

«Лукашенко комфортно на геополитических качелях между Москвой и Брюсселем»

Европейский парламент обращает свой взор на Беларусь. В эти дни в Брюсселе должна состояться дискуссия по "белорусскому вопросу". В Минске находится делегация европейского парламента для проведения консультаций и выработки позиции по формированию Парламентской ассамблеи "Евронест". Сегодня многие эксперты уже говорят об ошибочности выбранной Европой тактики в отношениях с Минском, о том, что стремление начать диалог без предварительных условий было расценено как слабость Европы, готовность к всепрощению. А потому ни на какие серьезные шаги по приближению политического климата в нашей стране к общеевропейскому Александр Лукашенко не пошел.

Будет ли сделана "работа над ошибками"? Вот комментарий сопредседателя Объединенных демократических сил ***Анатолия ЛЕБЕДЬКО****.*

— Чего вы ожидаете от предстоящей дискуссии и визита депутатов Европейского парламента в Минск?

— Думаю, риторика парламентариев будет жестче и конкретнее, нежели у чиновников из Брюсселя. И здесь для нас важно, чтобы вопрос не ограничился только обсуждением проблем польского меньшинства в Беларуси, а если это произойдет, то в проигрыше окажутся все сторонники перемен в Беларуси, включая и Союз поляков.

Но вообще говоря, нам нужна одна позиция, одно послание ЕС, Европейскому парламенту, всем международным организациям. Мы должны открыто и ясно говорить об изъянах "новой стратегии" Брюсселя. Необходимо найти баланс ценностей и интересов. Демократические ценности — это тот политический кислород, без которого невозможно выживание ни белорусов, ни поляков, ни украинцев, ни евреев, ни русских, проживающих в сегодняшней Беларуси. Это иллюзия, что можно обеспечить перемены в европейской стране, не затрагивая политическую систему и делая ставку на бартер, целиком состоящий из экономического прагматизма. "Новая стратегия" Брюсселя оказалась неэффективной и нежизнеспособной, потому что из нее удалили демократические ценности, а это сердце ЕС.

— Чем вызвано изменение риторики Брюсселя по отношению к официальному Минску?

— Полным отсутствием результатов и демонстративным поведением Лукашенко. За 2010 год в копилке "новой стратегии" нет даже каких-то формальных, количественных показателей успеха в Беларуси. Запад помог Лукашенко избежать дефолта, и белорусский правитель уверовал в свою исключительную ценность и важность. Он бы хотел и дальше за деньги спонсоров качаться на геополитических качелях между Брюсселем и Москвой, при этом посылая воздушные поцелуи то Медведеву с Путиным, то Баррозу и Меркель.

— То есть, по-вашему, Европа должна отказаться от "новой стратегии", от диалога с властями Беларуси?

— Самое плохое — это бросаться из одной крайности в другую. Очевидно, что нужен четкий план действий, без него стратегия Брюсселя выглядит аморфной декларацией намерений. Следует отношения с "Красным домом" направить в русло переговорного процесса, с фиксированной повесткой дня и с людьми, наделенными полномочиями говорить и принимать решения.

Брюсселю необходимо определиться с главной задачей, которую надо решить в Беларуси. И это не может быть, например, непризнание Осетии и Абхазии. Беларуси нужны серьезные институциональные изменения, например, свободные, поистине демократические выборы. Актуальность формулы "кредиты в обмен на свободные выборы" в сегодняшних условиях лишь возросла.

— Но если Брюссель не станет корректировать свою политику, к чему это приведет?

— А это уже привело к тому, что правозащитные организации не в состоянии осуществлять поддержку репрессированных. Люди не в состоянии на протяжении длительного времени выплатить штрафы. Парализована работа многих неправительственных организаций. Не улучшается ситуация со свободой СМИ. Интересы, и в первую очередь экономические, вытесняют ценности, а значит, политика становится аморальной и циничной. Власть близка к тому, чтобы реализовать свою формулу "легитимизация в обмен на консервацию того, что есть".

— Ваш прогноз на развитие отношений между Западом и официальным Минском?

— Проблема в том, что внимание к "белорусскому вопросу" формируется по остаточному принципу. Мы не приоритет для Брюсселя. Плюс очень сложная бюрократическая процедура выработки и принятия решения внутри Европейского Союза. Поэтому быстрых и кардинальных изменений в политике ЕС ожидать не приходится. Но мы должны работать на то, чтобы маятник вновь качнулся в сторону демократических ценностей.

Игорь МОРОЗОВ.

Яўген Варсін вяртаецца ў спорт?

Новым старшынёй Федэрацыі хакея Беларусі можа стаць былы міністр спорту.

Па паведамленні газеты "Прессбол" са спасылкай на крыніцы блізкія да алімпійскага штаба ў Ванкуверы, менавіта Яўген Варсін можа ўзначаліць хакейную федэрацыю.

Нагадаем, што пасля таго, як былы кіраўнік Уладзімір Навумаў папрасіўся ў адстаўку, 21 студзеня выконваючым абавязкі старшыні быў прызначаны Уладзімір Швабоўскі. З кандыдатурай неабходна вызначыцца да 15 сакавіка. Яўген Варсін каля чатырох гадоў быў міністрам спорту, у свой час гуляў у другой лізе хакейнага чэмпіянату СССР за "Тарпеда". Зараз ён — намеснік генеральнага сакратара Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.

Алесь СІВЫ.

Каму можна не баяцца грыпу

Днямі Міністэрства аховы здароўя на сваім сайце размясціла вынікі аднаго даследавання. Як аказалася, у студзені і лютым гэтага года медыкі вывучалі імунны статус мінчан, прасцей кажучы, высвятлялі, ці можам мы процістаяць грыпу.

У мінчан, якія звярталіся па медыцынскую дапамогу, бралі спецыяльныя пробы. Вынікі даследавання атрымаліся наступныя: найбольшая частка з тых, хто трапіў у медыцынскі эксперымент, — каля 58 працэнтаў — мае высокі ўзровень абароны адносна вірусаў грыпу А, так званага сезоннага грыпу. 20 працэнтаў могуць не баяцца свінога грыпу, бо ў іх арганізме таксама выяўлены абарончыя ўзроўні антыцел адносна магчымай хваробы.

Лічбы сапраўды неблагія. Але наўрад ці можна расслабляцца. Бо літаральна за дзень да апублікавання вынікаў данага даследавання з'явілася іншая інфармацыя. Галоўны пазаштатны анестэзіёлаг-рэаніматолаг Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама **Аляксандр ДЗЯДЗЬКО** паведаміў, што ў мінулым годзе ў бальніцы Мінска з дыягназам "пнеўманія" было шпіталізавана 11 тыс. 550 чалавек, што на 2 тыс. 225 больш, чым у 2008 годзе. У рэанімацыях Мінска аказаліся 796 чалавек, 152 з іх мелі неабходнасць у штучнай вентыляцыі лёгкіх. 123 чалавекі памерлі ад пнеўманіі, у 88 запаленне лёгкіх было выклікана новым вірусам грыпу — свіным.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Усёй сям'ёй — у дэпутаты

Падобна на тое, што адна беларуская сям'я праз некаторы час можа трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса праз сваю палітычную актыўнасць. Уся сям'я народнага дэпутата СССР Мікалая Петрушэнкі вылучаецца кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў.

На выбарах, якія адбудуцца 25 красавіка, сам Мікалай Петрушэнка будзе балатавацца ў Віцебскі абласны, ягоная жонка Галіна — у Талачынскі раённы, а іх сын Аляксандр — у Коханаўскі пасялковы Саветы.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

С МВФ в Таможенный союз?

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Россия давно обозначила свой подход в экономических отношениях с бывшими республиками распавшегося СССР, который коротко можно назвать рыночным. Словом, торговать по мировым ценам. Если желаешь со скидками, доплачивай чем-то другим. В частности, своей собственностью.

Беларусь местами принимала такие правила игры. Так, российскому "Газпрому" было продано 50% акций белорусского "Белтрансгаза". Договоренности по газу достигались сравнительно быстро, включая новый 2010 год, газ поставляется без пошлин.

Однако в белорусской прессе во время заключения Таможенного союза в декабре прошлого года было анонсировано, что Россия будет, по крайней мере в начале 2010 года, поставлять нефть Беларуси на прежних условиях, т.е. с пониженной вывозной пошлиной. Белорусская сторона, входя в Таможенный союз, вообще рассчитывала получать любые энергоносители без всяких пошлин. И не без оснований. Суть таможенных союзов — это прежде всего беспошлинные перемещения товаров через границы его участников. Все таможенные службы выносятся на периметр границ участников союза, а сами таможенные пошлины унифицируются.

Видимо, на момент создания Таможенного союза российская сторона свои особые планы насчет поставок нефти Беларуси не афишировала. Ждала, чтобы все прошло гладко. А дождавшись, своими вдруг выдвинутыми условиями, прямо скажем, "ошарашила" белорусских переговорщиков. Россияне в ходе изнурительных переговоров в итоге заставили белорусскую сторону подписать "нефтяную капитуляцию", согласно которой решено беспошлинно поставить нам сырую нефть только для целей внутреннего потребления. Это 6,3 млн тонн, учитывая, что 1,7 млн тонн добывает сама Беларусь. Цена на остальные миллионы тонн (21,5 млн т — 6,3 млн т) будет включать 100%-ную вывозную пошлину.

В результате изменений условий поставки нефти в январе месяце два наших НПЗ работали с неполной загрузкой. Около половины объемов нефтепереработки обеспечивали российские компании-давальцы, а создать для них условия, которые были бы не хуже прошлогодних, не представляется возможным. Другой вопрос, как сделать прибыльными продажи нефтепродуктов на внешних рынках? Аналитики оценивают потери белорусского бюджета от новых условий внешнеэкономической деятельности не менее 2 млрд долларов. Тогда с выполнением напряженных планов на 2010 год по росту ВВП, зарплаты, чего хотите — вообще "полный завал". Вот что значит посадить экономику Беларуси на "нефтяную и газовую иглу". Нет, например, у той же Финляндии, которая в свое время входила в состав Российской империи, никаких торговых проблем с Россией. У них рыночные отношения без всяких льгот и преференций.

Третий вопрос — вопрос о зачислении средств от взимания таможенных платежей на национальные счета. Платежи взимаются на общем периметре границы трех государств-участников Таможенного союза. Но главное направление экспортно-импортных операций Союза белорусское. Неважно. Раз Союз, то сначала пошлины в "общак", а честная доля Беларуси — 5%. Соответственно Казахстана — 8,5, а России — 86,5%. Попытки белорусской стороны увеличить свою долю хотя бы на 0,3% пока ни к чему не привели.

С 1 июля, по сути, гарантировано повышение ввозных пошлин до российского уровня на иномарки, ввозимые для населения Беларуси. Это сделает их дороже на 30—50% и более. Покупайте, белорусы, славную продукцию российского автопрома. Она, естественно, без пошлин. Наши нефтезаводы с пошлиной в цене сырья на голодном пайке, а российские "ГАЗ" и "ВАЗ", отверточные сборки иномарок получают новый рынок сбыта.

Нефтепереработка дает Беларуси не менее трети валютной выручки, второй валютный донор — РУП "Беларуськалий" снизил в 2009 году экспорт калийных удобрений в 2 раза, а валютная выручка из-за ценового фактора упала почти в 3 раза. В связи с ухудшением финансовой ситуации "Беларуськалий" в январе обратился в правительство с просьбой снизить наполовину размер экспортной пошлины, а это опять уменьшение поступлений валюты в страну.

(Окончание на 3-й стр.)

ПАЛІТКУХНЯ

Ляўковіч у дэпутаты не ідзе... Як і іншыя

Выбарчая кампанія для дэпутатаў мясцовых Саветаў набірае ход. Зараз зарэгістраваны ініцыятыўныя групы магчымых кандыдатаў у дэпутаты. Ідзе збор подпісаў за іх вылучэнне.

Не так даўно "Народная Воля" высвятляла ў лідэраў апазіцыйных партый, ці збіраюцца яны ўдзельнічаць у гэтай кампаніі. Адзіным, хто сумняваўся на той момант, быў старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч. Дык што ж ён вырашыў у рэшце рэшт?

Наша газета вырашыла вярнуцца да той размовы з Анатолем Іосіфавічам. Высветлілася, што Ляўковіч, як і ўсе астатнія партыйныя лідэры, у дэпутаты не ідзе. Сваё рашэнне палітык патлумачыў так: *"Ад нашай партыі ісці на выбары і так ёсць каму. Я як старшыня партыі буду каардынаваць дзеянні нашых кандыдатаў і сачыць за ходам выбарчай кампаніі па ўсёй краіне. Разумееце, у выбарах рознага ўзроўню я ўдзельнічаю з 1985 года, а гэта ўжо чвэрць стагоддзя.... А вось у гэтай кампаніі ўсё ж такі вырашыў не ўдзельнічаць..."*

Калі паразважаць над шанцамі кандыдатаў ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады), то яны прыкладна такія ж, як і ў астатніх прадстаўнікоў апазіцыі... Але так склалася, што самая моцная партыйная арганізацыя БСДП — у Брэсце (па крайняй меры пра гэта не аднойчы заяўлялі кіраўнікі партыі). Ці азначае гэта, што менавіта ў горадзе над Бугам прадстаўнікі БСДП возьмуць уладу на мясцовым узроўні?

Анатоль Ляўковіч, аднак, не здолеў назваць нават колькасць патэнцыяльных партыйных кандыдатаў, якія збіраюцца змагацца за ўладу ў Брэсце, параіўшы звярнуцца да свайго намесніка Ігара Маслоўскага: *"Я ведаю толькі прыкладныя лічбы, а вось Маслоўскі, брэстаўчанін, сам ідзе ў дэпутаты. Дарэчы, я згодны з вамі, што менавіта ў Брэсце ў нас самая моцная партыйная арганізацыя. Я сам пэўны час яе ўзначальваў..."*

У сваю чаргу Ігар Маслоўскі паведаміў "Народнай Волі": *"У Брэсце ад нашай партыі ў дэпутаты збіраецца ісці сем чалавек. Менавіта столькі ініцыятыўных груп зарэгістравана. Шанцы? Шанцы ёсць заўжды. Праўда, пры ўмове сумленнага падліку галасоў..."*

Што ні кажыце, а цікавы факт: лідэры партый, грамадскіх рухаў, аб'яднанняў ухіліліся ад барацьбы за месцы ў мясцовых "парламентах". А што, дрэнна было б, калі б Мілінкевіч узначаліў Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў, а Ляўковіч — Брэсцкі, Калякін, напрыклад, Мінскі гарадскі? З такіх пляцовак лягчэй было б стартаваць падчас прэзідэнцкіх выбараў. Ці ніхто з пералічаных і не пералічаных асоб не марыць пра рэальную перамогу? Калі так, то навошта людзям галаву тлуміць?

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
26 лютага—1 сакавіка 2010 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Саюз ці цяжкі груз?

Расійцаў апыталі, ці бачаць яны сэнс у саюзе Беларусі і Расіі. 57 працэнтаў жыхароў суседняй дзяржавы адказалі, што гэтага сэнсу не бачаць, не чуюць і не адчуваюць.

Адказаць расійцаў папрасілі
(Каб не прыгнятаў сумненняў груз):
"Вось вам Беларусь,
І вось Расія.
Верыце вы ў гэтакі саюз?"
Апытання вынік нечаканы,
І пачуць хацелі не такі,
Бо выходзіць, што ў саюз так званы
Вераць толькі два кіраўнікі.

Цвікадзёр

Каб выратаваць Аршанскі інструментальны завод ад банкруцтва, Міністэрства прамысловасці прымусіла іншыя прадпрыемствы (МАЗ, БелАЗ, МТЗ і інш.) закупляць ягоную прадукцыю, у прыватнасці, цвікадзёры. Між тым "цвікадзёры" гэтыя прадпрыемствы маюць магчымасць вырабляць і самі.

"Купляць на тым заводзе найпрод!" —
У міністэрстве загадалі з гора.
І збавіўся ад крызісу завод
Пры дапамозе лома-цвікадзёра.
А нехта вельмі мудрасна дапёр,
За гэта я аддам яму даніну.
Вось толькі дзе знайсці нам
"Цвікадзёр",
Што выцягнуў бы з крызісу краіну...

Што больш патрэбна?

Як паведаміла прэса, штурмаўшчына ў Баранавічах па ўзвядзенні лядовага палаца коштам 20 мільёнаў долараў сарвала выкананне мясцовай праграмы "Грамадскі туалет". У выніку з гэтымі "бруднымі аб'ектамі" ў горадзе проста катастрофа…

Ці задаваў народу хтось пытанне,
Ці многа распаўсюджана анкет:
"Што вам патрэбна болей, грамадзяне:
Лядовы гмах-палац
Ці туалет?"
Шкада мне вельмі,
Што на тэму гэту
Няма пакуль што навуковых прац.
Не ўпэўнены, што фору туалету
Мог даць лядовы (і пусты) палац...

Да аднаго месца

На БелАЗе зафіксаваны унікальны выпадак лібералізму ў адносінах да п'яніц: прабачаны грахі ажно 33 "асілкам", якія праносілі алкагольныя напоі на вытворчасць, што ўразіла нават Генпракуратуру. Затое быў звольнены актывіст незалежнага прафсаюза "Рабочая салідарнасць" Юрый Лобан, які знаёміў сваіх таварышаў з інфармацыйным бюлетэнем.

Рабочыя на тым заводзе
Не "прасыхаюцца" зусім.
А іх таварыш —
Смех дый годзе! —
Газеты суне ў рукі ім.
Хто ж сее тут крамолу-шкоду?
Ды прафсаюзны актывіст!
Рашылі: гнаць яго з завода!
Патрэбен ён, як зайцу гліст.
А я мяркую, што за гэта
Дарэмна звольнілі яго:
Так мовіць, п'яніцы газета
Да месца толькі аднаго...

АКТУАЛЬНА!

Радзім ГАРЭЦКІ, акадэмік

Не дапусцім, каб Беларусь засталася без беларусаў

Ці можна лічыць чалавека беларусам, калі ён не размаўляе на роднай мове?

На гэта пытанне даўно адказаў адзін з заснавальнікаў сучаснай нацыянальнай літаратуры Францішак Багушэвіч. Ён сцвярджаў: *"Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так, як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі".* Зараз ЮНЕСКА занесла беларускую мову ў лік выміраючых на планеце. Адсюль вынікае, што і беларуская нацыя адначасна з роднай мовай робіцца выміраючай...

Адзнакі такога працэсу відавочныя. У якой яшчэ краіне свету можна ўбачыць, каб кіраўнік дзяржавы амаль зусім не выступаў на дзяржаўнай мове карэннай нацыі, а калі і прамаўляў некалькі беларускіх слоў, дык звычайна ў здзеклівым тоне пра апазіцыянераў; які пераканаць быццам на мове яго народа немагчыма выказаць вялікія думкі. І таму мову суседняй Расіі зрабіў таксама дзяржаўнай. Прычым фактычна — адзінай дзяржаўнай, што амаль цалкам выштурхала мову карэннай нацыі з уласнай хаты. Дзе існуе яшчэ краіна, у якой уся ўладная вертыкаль ад прэм'ер-міністра да старшыняў калгаса, ад старшыні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу да старшыні сельсавета, як і ўся чыноўніцкая раць амаль зусім не размаўляюць на роднай мове? У нас няма нацыянальнага тэлебачання, на якім рэдка гучыць родная гаворка. Нават дайшло да нечуванага дзікунства, калі амбасадару Швецыі Стэфану Эрыксану, які адказвае па-беларуску на пытанні, вядучыя тэлепраграмы задаюць іх па-руску? Ці ёсць у свеце Нацыянальная акадэмія навук, у якой падчас агульнага сходу можна не пачуць ніводнага слова на мове тытульнай нацыі, а ў Інстытуце беларускай мовы і літаратуры шэраг супрацоўнікаў карыстаюцца галоўным чынам мовай суседняй краіны? Дзе сустрэнеце старшыню Саюза пісьменнікаў, які не піша і не размаўляе на мове свайго народа? Чаму нават у сталіцы адправіць тэлеграму на беларускай мове клопатная праблема? Чаму цяжка купіць віншавальны канверт ці карталюшку па-беларуску! Паспрабуйце ў розных установах, такіх як ЖЭС, банкі, натарыяльныя канторы, аддзяленні сувязі, райсаветы і інш. знайсці беларускамоўныя бланкі! Ці многа шыльдаў у нашых гарадах і вёсках напісана па-беларуску? Дзе ў свеце можна знайсці краіну, каб амаль ніколі не пачуць на вуліцы слова на роднай мове?

Максім Гарэцкі яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя пісаў: *"Было б дзіўна і незразумела пытаць у расіяніна, ці хоча ён рускую мову ў школе? Глупства было б пытаць аб тым жа немца, француза, латыша ці эстонца. Чаму тады з дурнымі пытаннямі можна звярнуцца толькі да цёмнага беларуса?.."*

А як цяпер? Зусім нядаўна газеты паведамілі, што ў Магілёве, дзе амаль 370 тысяч жыхароў, няма не тое што школы — ніводнага беларускамоўнага класа! Ва ўсіх вялікіх і малых гарадах Беларусі толькі 34 беларускамоўныя школы. На роднай мове ў краіне навучаецца ўсяго 18,6 працэнта школьнікаў. Няма ніводнай беларускамоўнай вышэйшай навучальнай установы. І гэтыя лічбы з кожным годам змяншаюцца. Ці можна з маладога жыхара Беларусі такім чынам узгадаваць сапраўднага патрыёта, грамадзяніна?

Не толькі ўлады, адміністрацыйна-чыноўніцкі апарат, але ўвесь створаны імі лад жыцця вымушае беларуса размаўляць па-руску. Нават з Богам, — гэта тычыцца большасці вернікаў праваслаўнай царквы. Моладзь хутка схоплівае: навошта ім вучыць беларускую мову, калі ў гэтым няма жыццёвай неабходнасці? Без яе пражыць можна, а вось без рускай — не. І плывуць па цячэнні. Дажыліся, што часцяком, пачуўшы беларускую гаворку, многія здзіўлена ўскідваюць погляд, перапытваюць, а то і груба кідаюць: "Говорите на нормальном языке". Нярэдка за роднае слова чалавек трапляе ў ранг апазіцыянераў ці нават "ворагаў народа". Няўтульна беларускамоўнаму беларусу ў Беларусі. Нават адышоўшы ў іншы свет, большасць беларусаў ляжыць у роднай зямлі пад помнікамі з надпісамі па-руску...

Не магу прыняць пазіцыю лідэраў многіх партый і рухаў дэмакратычных сіл, якія карыстаюцца амаль спрэс рускай мовай: маўляў, каб больш людзей іх зразумела. Але сучасны стан беларускай мовы, нацыянальнай свядомасці і наогул беларушчыны патрабуе, каб яны ў першых шэрагах змагаліся за Беларускую нацыянальную ідэю, за сапраўдную беларускую Беларусь. Трэба зразумець, што **дэмакратычная, незалежная краіна без беларускай мовы, без беларушчыны — немагчыма. Згубім беларускую мову — згубім Беларусь!**

За апошнія 15 гадоў у краіне ідзе такі магутны прэсінг супраць роднай мовы, што інтэнсіўнасці гэтага працэсу маглі б пазайздросціць расійская імператрыца Кацярына II і яе служка генерал-губернатар Мураўёў. Чаму яны ў першую чаргу знішчалі родную нам мову? Таму, што разам з ёю ўзнікае роднасць, адзінства людзей на роднай зямлі, у іх абуджаецца нацыянальная самасвядомасць, і іх моц тады непераможная. Боязь гэтага і прывяла да палітыкі інтэнсіўнай русіфікацыі насельніцтва, эміграцыі беларусаў за межы краіны і іх асіміляцыі. Гэта кідаецца ў вочы і зараз. Асабліва шкада, што шмат з'ехала маладых людзей. Большасць хутка авалодала замежнымі мовамі, бо ў любой краіне свету немагчыма жыць, калі не ведаеш мовы карэннай нацыі. І тут толькі Беларусь уяўляе сабой сумнае выключэнне, бо мову яе народа, аказваецца, ведаць не абавязкова...

У такіх варунках вельмі патрэбны такія грамадскія аб'яднанні, як Таварыствы беларускай мовы і Беларускай школы, Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", Беларускі фонд культуры, а таксама культурна-асветныя рухі кшталту "Будзьма!". Але яны не ў стане карэнным чынам змяніць працэс манкуртызацыі насельніцтва без змены дзяржаўнай палітыкі. Усе беларусы, — і тыя, якія нясуць у сэрцы покліч "Жыве Беларусь", і тыя, што прамаўляюць "За Беларусь!", павінны змагацца за родную мову. Інакш іх заклікі будуць пустымі...

Наша цудоўная мова, на якой пісаў яшчэ Францыск Скарына, на якой надрукаваны Статут Вялікага Княства Літоўскага, пра якую Адам Міцкевіч сказаў, што *"...гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, якая ўзнікла даўно і цудоўна распрацавана"*, не павінна загінуць. Агульнымі намаганнямі яе трэба захаваць, пашырыць, каб яна стала галоўным моўным асяроддзем у Беларусі. Трэба падтрымаць прынятыя на V з'ездзе беларусаў свету і Радзе ТБМ звароты аб тым, каб **2010 год абвясціць "Годам роднай мовы".**

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной Воли" отвечает юрист Олег ВОЛЧЕК

Льготу вам должны вернуть

Я инвалид II группы и пенсионер по возрасту, проживаю в однокомнатной квартире. Когда прописал жену, которая является пенсионеркой, ЖЭС-4 лишил меня льготы по оплате коммунальных платежей. Правильно ли это?

Алексей Николаевич Толох, Барановичи.

Согласно Закону РБ от 14.06.2007 "О государственных социальных льготах, правах и гарантиях для отдельных категорий граждан", а именно подпункта 3.13 пункта 3 ст.16 этого закона, инвалиды I и II групп (кроме лиц, инвалидность которых наступила в результате противоправных действий, по причине алкогольного, наркотического, токсического опьянения, членовредительства), не имеющие трудоспособных членов семьи, обязанных по закону их содержать, и проживающие одни либо только с инвалидами I и II групп и (или) с неработающими пенсионерами, имеют право на 50-процентную скидку с платы за техническое обслуживание и (или) пользование жилым помещением в пределах 20 квадратных метров общей площади занимаемого жилого помещения. А также право на 50-процентную скидку с платы за коммунальные услуги (горячее и холодное водоснабжение, канализацию, газ, электрическую и тепловую энергию, вывоз и обезвреживание твердых бытовых отходов, пользование лифтами) по установленным законодательством тарифам (ставкам) в пределах утвержденных норм потребления, а проживающие в домах без центрального отопления -- за топливо, приобретаемое в пределах норм, установленных законодательством для продажи населению.

Обратитесь письменно с жалобой в вышестоящую организацию, которая курирует ЖЭС-4, также одновременно можете написать жалобу прокурору, который может внести представление в ЖЭС-4, чтобы Вам вновь вернули льготы по оплате коммунальных услуг.

Вопрос надо конкретизировать

Какие льготы имеет инвалид III и II групп и при каких условиях и каким документом они закреплены?

Николай Антоненко, житель Гомеля.

Ответить на этот вопрос однозначно невозможно, т.к. существует более 100 нормативных правовых актов, которые так или иначе касаются инвалидов II и III групп. Это такие, как:

— Закон Республики Беларусь от 11.11.1991 г. №1224-XII "О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь";

— Закон Республики Беларусь от 14.06.2007 г. №239-З "О государственных социальных льготах, правах и гарантиях для отдельных категорий граждан";

— Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 30.11.2007 г. №1650 "О некоторых вопросах бесплатного и льготного обеспечения лекарственными средствами и перевязочными материалами отдельных категорий граждан";

— Трудовой кодекс Республики Беларусь;

— Постановление Министерства здравоохранения Республики Беларусь от 27.02.2008 г. №45 "Об утверждении порядка льготного обеспечения аптеками отдельных категорий граждан перевязочными материалами по рецептам врачей";

— Жилищный кодекс Республики Беларусь;

— Кодекс Республики Беларусь о браке и семье и т.д.

Поэтому, если вы хотите получить более конкретный ответ на свой вопрос, необходимо его конкретизировать.

Если лишили родительских прав

Скажите, пожалуйста, какие у меня есть права и обязанности в отношении ребенка, если меня лишили родительских прав? С февраля 2007 года я выплачиваю денежные средства, т.к. мой ребенок находится на воспитании в опекунской семье (моя мама). А сейчас с меня требуют выплатить еще и за 2005—2006 год. Фактически половину зарплаты (317 тысяч бел. рублей) с меня удерживается, в то время как у родителей, которые платят алименты, взыскивается 25 процентов на одного ребенка (125 тысяч бел.рублей). Получается, что родители в моем статусе находятся в более жестких условиях, чем родители, выплачивающие алименты.

Наталья Жданович, Минск.

В соответствии со ст.82 Кодекса РБ о браке и семье родители, лишенные родительских прав, теряют все права, основанные на факте родства с ребенком, в отношении которого они были лишены родительских прав. В том числе и право на получение содержания от него, право на пенсионное обеспечение после смерти ребенка и право наследования по закону. Родитель, лишенный родительских прав, не может быть опекуном, попечителем или усыновителем.

Лишение родительских прав не освобождает родителей от обязанностей по содержанию детей. Вы можете встречаться с ребенком, но с согласия органа опеки и попечительства. Восстановление в родительских правах допускается только в судебном порядке по иску лица, лишенного родительских прав, если этого требуют интересы детей и если дети не усыновлены.

Согласно п.9 Декрета Президента РБ от 24.11.2006 г. №18 "О дополнительных мерах по государственной защите детей в неблагополучных семьях" взыскание расходов на содержание детей, находящихся на государственном обеспечении (это касается и опекунских семей), производится со дня помещения ребенка на государственное обеспечение, но не ранее дня принятия решения комиссии по делам несовершеннолетних об отобрании ребенка. Деньги прекращают взыскивать после их полного погашения или возникновения обстоятельств, влекущих освобождение от уплаты расходов. Следовательно, задолженности за 2005—2006 год с Вас взыскивают законно.

Если проанализировать данный Декрет с точки зрения законности, то он противоречит стст. 91, 109 Кодекса о браке и семье, которые устанавливают сроки, в течение которых могут быть предъявлены требования о взыскании алиментов. Так, если родители не представляют содержание своим несовершеннолетним детям, средства на их содержание (алименты) взыскиваются с родителей в судебном порядке, но алименты могут быть взысканы не более чем за три предшествующих года.

Также этот Декрет вступает в противоречие с Законом "О нормативных правовых актах РБ". Согласно ст.67 данного Закона Декреты Президента не имеют обратной силы, за исключением случаев, когда они смягчают или отменяют ответственность граждан. В Вашем случае Декрет №18 усиливает ответственность и ухудшает имущественное положение, обязывая Вас выплачивать деньги на содержание ребенка более чем за три предшествующих года.

Суммы, которые у Вас высчитывают, сопоставимы с алиментами, которые начисляют на родителей, имеющих трех и более детей. Получается, что глава государства своим решением поставил Вас в более тяжелое финансовое положение, чем тех родителей, кто платит алименты на одного ребенка.

Как юрист, я не разделяю подход президента единолично издавать свои Декреты (которые имеют силу закона), депутаты должны вносить изменения в Кодекс о браке и семье, который регулирует данные правоотношения между родителями, лишенными родительских прав, и их детьми. Но в данном случае, Вы обязаны платить денежные средства на содержание Вашего ребенка, пока ему не исполнится 18 лет.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Скалечаная праўда

Па радыё, тэлебачанні, з трыбун розных нарад чуеш: пенсіі ў нас павышаюцца, заробкі растуць, народ танчыць гапака ад радасці за жыццё. Такая рэчаіснасць: горкая праўда пра існаванне мільёнаў людзей знікла, народ пояць і кормяць, як кажуць, казкамі пра белага бычка.

Задумаемся над канкрэтнымі лічбамі. Аказваецца, наш сярэдні заробак па краіне складае недзе ў межах 375 долараў, і дзяржаўныя мас-медыя выстаўляюць гэту лічбу на "ўра!". Хоць што такое сёння 375 долараў? Для цывілізаваных краін Еўропы — гэта не грошы, за якія чалавек можа пражыць. Такі нізкі заробак у іх забаронены законам. Лічыцца, што ён можа толькі зняважыць грамадзяніна, апусціць яго ў глыбокую бядняцкую яму, з якой, на жаль, не могуць выбрацца некаторыя афрыканскія краіны. Але ж там — голая Афрыка, а мы жывём пакуль у Еўропе.

Сёння расіяне здзекліва ўсміхаюцца: "Ну што, беларусы, дажыліся? Пры фактычна аднолькавых цэнах на харчаванне мы, рускія, зарабляем у 3—5 разоў больш". І перацягваюць да сябе танную рабсілу, а на некаторых беларускіх будоўлях пачаўся дзікі лямант: "Не хапае людзей! Стаяць аб'екты!"

Зусім нядаўна праскочыла вестка — хутка тысячамі пачнём запрашаць да сябе гастарбайтэраў з Азіі. Уся Еўропа катэгарычна выступае супраць прыблуднікаў на сваіх землях, баючыся іх масавых рассяленняў, мы ж пачынаем чужынцаў вербаваць. Поўны завал і чарговы эксперымент над карэннай нацыяй!

Мінімальны заробак у Беларусі, як паведамлялася, склаў 258.600 рублёў, а гэта ў 1,7—5 (!) разоў меней, чым у бліжэйшых суседзяў. У параўнанні з Расіяй гэты паказчык у нас ніжэйшы ў 1,7 раза, у параўнанні з Літвой — у 3,7, Латвіяй — у 4, Польшчай у 5 разоў. Нават жыхары далёкай лацінаамерыканскай Аргенціны маюць мінімальны заробак у 4 разы большы, чым у нас.

Закруціўшыся ў штодзённай віхуры, слухаючы балбатню дзяржаўных прапагандыстаў, мы амаль не прыпамінаем тое, што беларускі беспрацоўны валачэ сваё існаванне на... паўдолара ў месяц, а ў найбяднейшых краінах жабракі маюць долар у суткі (міжнародны крытэрый жабрацтва — даход на чалавека меней за два долары ЗША ў суткі). Куды ж мы прыехалі, што з намі адбылося?

Але ў дзяржаўных структурах — нуль эмоцый, выпешчаныя твары чыноўнікаў блішчаць ад сытага задавальнення, быццам нічога не разумеюць і нічога благога не адбываецца, маўляў, ніякіх праблем не існуе, а на "дробязі" не варта звяртаць увагу. Краіна квітнее, злітным агулам багацеем, і люд усім задаволены!

Давайце зазірнем глыбей, пастараемся разабрацца яшчэ ў адной намалочанай трусе, якую нам выдаюць за смачнае зерне. У нас колькасць адносна бедных грамадзян складае 12,5 працэнта ад усяго насельніцтва, у краінах ЕС — каля 17 працэнтаў. Але ж за рысай беднасці ў Еўропе тыя, у каго даходы ў год ніжэй дзесяці тысяч еўра, а ў нас — 1700. Вось чаму там большасць спакойна існуе за рысай беднасці, а ў нас такая кагорта людзей апынулася за рысай жабрацтва.

Сёння мы ўжо прывыклі, не плюёмся і не гыркаем у грамадскім транспарце на пенсіянераў, калі з-за іх багажу — пустых бутэлек і вязанак тоўстага кардону, паназбіраных зранку на смуродных сметніцах, якія яны вязуць на прыёмныя пункты, зарабляючы капейчыну, немагчыма праціснуцца да выхаду. Не мазоляць нам вочы і рабочыя са штодзённымі "візітоўкамі" — цэлафанавымі пакетамі-сабойкамі, бо грошай на нармальныя абеды не хапае.

Каб хоць нейкім чынам выкруціцца, дзяржава залазіць у пазыкі. Звярніце ўвагу на такія лічбы: знешняя пазыка Беларусі за 2009 год павялічылася ў 2,1 раза, аж да 7,891 мільярда долараў! Даўгоў сабралася амаль па дзве тысячы долараў на аднаго жыхара краіны, уключаючы дзяцей. Калі ж мы ўсё паддаём?

Думаючы пра перспектывы краіны, разважлівыя людзі бяруцца за галаву: што нас чакае? Але ж тут на экранах тэлевізараў з'яўляецца міністр фінансаў і аптымістычна заяўляе, быццам у нас усё ў ажуры, плакаць не трэба. Як гэта? А вось так: сур'ёзных праблем з абслугоўваннем (*якое мяккае слова!* — **Аўт.**) дзярждоўгу ў Беларусі няма, "знешнія займы дастаткова камфортныя для нас".

Пафасна назойлівае тэлебачанне лёгка трансліруе і навязвае масам, адарваным ад аб'ектыўнай інфармацыі, свае перакананні — наш мяккі і падатлівы люд з прыпадкамі талерантнасці лёгка заглынае ўсё тое, што яму прыпадносяць. Ён не ў сілах спакойна разабрацца і выказаць абурэнне, бо яму не хапае ні канкрэтных параўнальных лічбаў, ні часу, а пасля і жадання —-дзяржаўныя мас-медыя фактычна яго затуркалі.

Мы агульна і без перастанку крытыкуем усіх тых замежнікаў, хто не згодны з курсам Лукашэнкі і асуджае беларускі рэжым. Мы кажам, што замежнікі пацяшаюцца з нашага быту і чапляюцца да нас толькі па палітычных матывах. Жывучы ў наглуха спёртым інфармацыйным вакууме, мы не атрымліваем аб'ектыўных звестак пра жыццё за кардонам. Споўзшы ў сваю цёмную яму, мы не ведаем, колькі зарабляе інжынер-праграміст у Польшчы, Германіі і ЗША. Колькі там зарабляе настаўнік, хірург, вадзіцель аўтобуса, бібліятэкар, якая там сярэдняя пенсія і колькі каштуе кілаграм мяса...

Заўважце — у нас як быццам няма жалезнай заслоны, але людзі па-ранейшаму не ведаюць, што робіцца ў свеце. Як і ў савецкія часы, на такую інфармацыю накладзена табу. Сляпымі і глухімі лягчэй кіраваць, ім можна вешаць локшыну на вушы... Сучасная ідэалогія лукашэнкаўскага рэжыму базіруецца на пастулатах тых самых бальшавікоў, што 70 гадоў запар будавалі райскае жыццё на планеце, дашчэнту абкрадаючы краіну і акалпачваючы просты люд.

Ад прапагандысцкай хлусні з'яўляецца гіпертрафіраванае адчуванне: бачыш адно, а табе ўнушаюць другое; ты ледзь зводзіш канцы з канцамі ў сямейным бюджэце, а трубадуры з дзяржаўных СМІ шчабечуць, што ў нас усё выдатна.

Мільёнам людзей невыносна цяжка, а вакол — спевы, танцы, авацыі... Мне асабіста ўсё гэта нагадвае шабаш, які да дабра не давядзе.

Пятро СМАЛЯНКА,
жыхар Мінска.

Павышаецца кошт праезду ў гарадскім грамадскім транспарце

Згодна з пастановай Міністэрства эканомікі, паездка ў грамадскім транспарце Мінска будзе каштаваць 700 рублёў (зараз — 600), у абласцях — 600 рублёў (зараз — 500).

Паводле інфармацыі афіцыйнага сайта Мінэканомікі, узгоднены таксама межавыя максімальныя тарыфы на перавозкі пасажыраў гарадскімі аўтобусамі экспрэсных рэгулярных маршрутаў з дазволенай максімальнай масай больш за 5 тыс. кг: у Мінску — 1100 рублёў за паездку, у абласцях — 900 рублёў.

Павышэнне тарыфаў на праезд у грамадскім транспарце сталіцы адбудзецца пасля прыняцця адпаведнага рашэння Мінскім гарвыканкамам і яго афіцыйнага апублікавання.

Сяргей ПУЛЬША, БелаПАН.

За незаконнае паляванне затрыманы начальнік ДАІ Астравецкага раёна

Пракуратурай Гродзенскай вобласці распачата крымінальная справа за незаконнае паляванне (ч.4 арт.282 КК) у дачыненні да начальніка аддзялення ДАІ Астравецкага РАУС і групы грамадзян.

Як паведамілі БелаПАН у абласной пракуратуры, афіцэр міліцыі затрыманы. Яму выстаўлена абвінавачанне. Ролю кожнага з удзельнікаў групы, якая палявала, установіць следства.

Колькі будуць каштаваць квіткі на «Be2gether»?

Колькі ў гэтым годзе прыйдзецца патраціць грошай на музычны фестываль "Be2gether"? І дзе ён будзе праходзіць?

Таццяна, 17 год, Мар'іна Горка.

У гэтым годзе фестываль будзе праходзіць з 25 па 27 чэрвеня ў Літве каля Нарвялішскага замчышча за 100 метраў ад беларуска-літоўскай мяжы.

А вось квіткі можна будзе набыць у продажы ўжо ў бліжэйшы час. Чым раней вы набудзеце квіток, тым танней ён абыдзецца. Кошт першых квіткоў складзе 150 тысяч беларускіх рублёў, а перад канцэртам вам прыйдзецца аддаць за яго да 350 тысяч.

Аб пачатку распаўсюджвання можна даведацца, падпісаўшыся на рассылку афіцыйнага сайта фестывалю www.b2g.lt.

Марыя МАЛЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 лютага—1 сакавіка 2010 г.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

С МВФ в Таможенный союз?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Белорусское правительство рассчитывает, что 1 июля, когда будет введен единый таможенный тариф в рамках Таможенного союза, вновь вернуться к вопросам поставки нефти. Однако Кремль твердо заявил, что вопросы, связанные с поставками энергоносителей, будут и впредь выведены за рамки Союза и будут регулироваться отдельными соглашениями. Более того, в правительстве Российской Федерации сейчас срочно ищут источники компенсации потерь бюджета вследствие предоставления льгот нефтяникам Восточной Сибири с целью скорейшего заполнения нефтепровода Восточная Сибирь — Тихий океан. Один из источников — отмена для Беларуси нулевой ставки экспортной пошлины на газ вслед за нефтью, что даст российскому бюджету за год порядка 30 млрд российских рублей. Вот такой Таможенный союз! Может, не следовало в свое время "наезжать" на российского вице-премьера Кудрина, главу правительства Путина? Политес, знаете ли, в отношениях между государствами, даже с союзником, — дело не последнее.

Сумев удержать в прошлом кризисном году ВВП от падения (100,2%), правительство и Нацбанк бодро заявили, что в 2010 году белорусская экономика не будет нуждаться во внешних заимствованиях. Вероятно, прикинули, что придут последний транш МВФ около 700 млн долларов и очередной транш "Газпрома" за акции "Белтрансгаза" в 625 млн долларов, мировые цены на нефть станут 100 долларов за баррель и т.д. А россияне их кинули. Значит, необходимо вновь обращаться за помощью к Фонду, о чем и заявил глава Нацбанка. О том, что российское правительство "подвесило" еще в мае месяце свой последний транш в 500 млн долларов из трехмиллиардного кредита, уже и не заикаются. С МВФ намерены вести переговоры о предоставлении кредита в размере 3 млрд долларов. По оценкам специалистов, Беларуси по "скорой помощи" необходимо не менее 5 млрд долларов.

Хитрый МВФ и не прочь продолжать финансировать экономику Беларуси, хотя остаются невыполненными многие его важные условия по ее реформированию. К примеру, до сих пор не созданы агентство по приватизации и агентство финансового развития. Не начата приватизация пяти значимых предприятий, выделенных в первую очередь для этих целей. Можно напомнить и его другие требования. Это ослабление контроля над ценами, либерализация зарплат, отказ от рефинансирования из бюджета госбанков, снижение присутствия государства в частном секторе, расширение доступа частного сектора к кредитам, снижение налоговой нагрузки на малый бизнес, отмена обязательных количественных директивных показателей как на макроуровне, так и на уровне предприятий и т.п. Однако на сегодня доля малого бизнеса в ВВП Беларуси меньше 10%, а доля его налогов в общем их сборе в два раза больше. Директивные ростовые показатели не только не отменяют, но и ужесточают ответственность за их невыполнение. Есть предложение перезаключить контракты с руководителями предприятий на один год — до 1 января 2011 г. и расторгать их с теми руководителями, которые не выполняют прогнозные показатели. Но МВФ на многое стал закрывать глаза. Даже на несоблюдение демократических свобод. Все более очевиден политический подтекст в его кредитах. Пусть Беларусь будет в большей мере должна Западу, нежели Востоку.

Внешний государственный долг Беларуси в 2009 году вырос в 2,1 раза — до 7,89 млрд долларов и существенно превысил величину золотовалютных резервов страны (около 6 млрд долларов). Валовой долг, который включает долги предприятий и банков, приближается к 20 млрд долларам. Основные платежи по долгам начнутся с 2012 года. По международным критериям внешний долг, не превышающий 50% ВВП, не несет особой угрозы экономике. Даже у многих развитых государств он значительно выше. Но поскольку экономика Беларуси идет своим особым путем, нелишне будет вспомнить о ее особенностях. Сырьевая ориентация: нефтепродукты из российской нефти и калийные удобрения — основа экспортного потенциала, главный источник формирования доходов бюджета; валообразующая экономика — 100 предприятий создают основную часть ВВП, нереализованная продукция на сумму 6—7 трлн рублей находится в складских запасах; низкая конкурентоспособность машиностроения и других сложно-технических отраслей; избыточная занятость и низкая производительность труда (порядка 300 тысяч работников трудятся в режиме неполной занятости, скрытая безработица); отрицательное сальдо внешней торговли (свыше 5 млрд долларов).

"Есть постановления Кабмина времен Леонида Даниловича Кучмы, что за экс-президентом в течение года сохраняется госдача с обслуживанием, госохрана, а закон Украины о госслужбе фиксирует, что он имеет право на 85% должностного оклада со всеми надбавками. Дальнейшую участь президента решает правительство новыми постановлениями. Ведь в Украине до сих пор нет закона о президенте, где бы все это было прописано. Но еще не было случаев, чтобы президента спустя год, например, выселяли", — говорит Михаил Папиев, министр труда и соцполитики в правительстве Януковича.

КУЧМУ ХОТЕЛИ ОБИДЕТЬ

Действительно, за предыдущими двумя президентами Украины сохранились дачи, обслуга, транспорт, водители, медицинское и санаторно-курортное лечение. Но попытки лишить Леонида Даниловича льгот были. В январе 2005 года, накануне отставки, и.о.премьера Николай Азаров подписал постановление, по которому Кучма получил в пожизненное пользование госдачу в Конча-Заспе с персоналом (4 водителя, две горничные, два официанта и повар), пенсию в размере служебного оклада президента (4600 грн. — столько получал Кучма), два авто, охрану, помощника и советника. Но спустя неделю ставшая премьером Юлия Тимошенко постановление отменила. Вновь оно обрело силу в 2007 году, когда у руля встало правительство Януковича. В перерыве между 2005-м и 2007 годами "оранжевая" власть грозилась выселить чиновников с госдач, но не сделала этого. А Кучма оформил 18 тысяч пенсии как нардеп 1-го созыва. "Тимошенко продемонстрировала свою дикость. Мы — люди цивилизованные и должны отдать должное экс-президенту, каким бы он ни был", — говорит Папиев.

В закрытом городке Конча-Заспа у Виктора Андреевича знатные соседи: кроме Кучмы и Кравчука, здесь живут бывший и нынешний спикеры Александр Мороз и Владимир Литвин, верный соратник президента Юрий Еханурoв, вице-премьер Иван Васюнык и кума Оксана Билозир. Если же эта компания Ющенко надоест — он волен переехать в Безрадичи, где у него личный хутор с коллекцией глечиков Трипольской культуры.

КРАВЧУКУ — BMW И ДОМ СЕКРЕТАРЯ ЦК

С первым президентом Украины Леонидом Кравчуком расстались цивилизованно. "Он звонил мне на работу, мы обсуждали вопрос автомобиля, который к нему собирались прикрепить, — вспоминает регионал Дмитрий Табачник, который в то время был главой администрации Кучмы. — Автопарк был бедный. Мы дали ему подержанный BMW, а когда Кабмин закупил представительскую партию машин, я переговорил с премьером Валерием Пустовойтенко, и Кравчуку выделили новый BMW. Леонид Макарович звонил мне и по бытовым вопросам. Мой заместитель по хозчасти Петр Теремчук ездил осматривать домик Кравчука. Он захотел жить на отшибе — в Конча-Заспе, в бывшей резиденции члена политбюро и секретаря ЦК Николая Борисенко. Там все было в упадке. Мы быстро сделали ремонт, пока Кравчук был на отдыхе". В этом доме первый президент Украины живет до сих пор.

Китайские коммунисты приняли новый моральный кодекс

В нем 52 пункта, прежде всего направленных на борьбу с коррупцией, которая является серьезной проблемой в Китайской Народной Республике.

Кодекс строителей китайского коммунизма утверждает, что партийцы должны работать на благо народа, не используя при этом в личных целях свое привилегированное положение.

В частности, согласно новым правилам, одобренным Центральным комитетом Коммунистической партии Китая (ЦК КПК), китайские коммунисты не должны принимать подарки или использовать свое влияние на благо членов своей семьи. Китайским коммунистам запрещается также спекулировать недвижимостью и заниматься бизнесом.

Новые правила запрещают партийцам совершать чрезмерные траты при организации свадеб или похорон, а также позволять себе роскошный отдых. Отныне коммунисты также не должны тратить необоснованно большие суммы на обустройство своих офисов и покупку служебных автомобилей. В некоторых регионах страны горкомы напоминают пятизвездочные отели.

ЦК предупреждает, что членов партии, нарушивших правила, ждет суровое наказание вплоть до уголовного преследования.

Фидель Кастро чувствует себя «исключительно хорошо»

Лидер кубинской революции Фидель Кастро чувствует себя "исключительно хорошо", заявил президент Бразилии Лула да Силва, слова которого приводит кубинский портал Cubadebate.

На встрече Лула да Силвы и Фиделя Кастро также присутствовал Рауль Кастро и один из участников бразильской делегации. На фотографиях, сделанных фотографом бразильского лидера и опубликованных порталом Cubadebate, собеседники оживленно беседуют, а лидер кубинской революции выглядит бодрым и оживленным. По сообщению кубинского телевидения, на встрече обсуждались результаты недавно завершившегося в Мексике саммита "За единство Латинской Америки и Карибского бассейна".

Ушла...

Маргот Кесман ушла в отставку с поста главы Совета евангелических церквей Германии. Кроме того, она отказалась от должности епископа Ганноверского. Таким образом Маргот Кесман сделала выводы из скандала, в центре которого она оказалась в прошедшие дни. 20 февраля Кесман была задержана полицией в нетрезвом виде за рулем автомобиля. Полиция остановила епископа после того, как она, проигнорировав красный свет светофора, продолжила движение. Тест на содержание алкоголя обнаружил в крови задержаной 1,54 промилле.

Позже Маргот Кесман признала, что "сама в ужасе от той чудовищной ошибки, которую совершила". "Мне известно, насколько опасно и безответственно садиться за руль в нетрезвом состоянии. Безусловно, я готова нести всю ответственность за случившееся", — заявила она.

Что сказал бы Собчак о сегодняшней российской демократии?

Его считают учителем и наставником самых влиятельных людей в государстве. На днях, пишет немецкий Der Spiegel, Владимир Путин и Дмитрий Медведев вспоминали своего "крестного отца" Анатолия Собчака, получив возможность "понежиться в лучах славы иконы российского демократического движения".

Народ его любил за блистательные выступления — как на трибуне Ленсовета, так и на площадях и улицах родного Ленинграда. Почти 80% жителей города, продолжает автор публикации Беньямин Биддер, поддержали его кандидатуру на выборах мэра северной столицы, которая именно по его инициативе вернула историческое название: Санкт-Петербург. Целью фильма "Анатолий Собчак. 10 лет спустя", показанного российским телевидением в 10-ю годовщину смерти Анатолия Собчака, было прежде всего напоминание об огромном политическом таланте "наставника и учителя второго и третьего российских президентов", пишет журналист.

"Поминальная" картина о Собчаке стала примечательным событием еще и по той причине, что в последнее время упорно ходят слухи о якобы наметившейся между Медведевым и Путиным борьбе за власть. Так, три недели назад в Калининграде на улицы вышли около 12 тыс. человек, и на плакатах были требования к отставке Путина (к отставке Медведева не призывал ни один, замечает издание).

В фильме же, подчеркивает Биддер, обе "головы" российского властного тандема подчеркивают свою общность, говоря об общих корнях. Их телевоспоминания о Собчаке, иконе российской демократии, должны подчеркнуть всю серьезность либеральной программы Медведева, считает московский политолог Сергей Мухин. Неслучайность замысла выпустить эту картину подчеркивают и сроки ее создания — по словам режиссера Александра Габниса, фильм был отснят и смонтирован в течение трех недель.

При этом, продолжает автор публикации, в нем не сказано ни слова о том, что Собчак в свое время обвинялся в злоупотреблениях должностными полномочиями и коррупции. Авторы фильма забыли рассказать и о том, что в 1992 году была создана комиссия Санкт-Петербургского горсовета для расследования деятельности Владимира Путина на посту заместителя Собчака по подозрению в коррупции и хищении средств. Комиссия представила доклад, известный как доклад Марины Салье, и горсовет призвал Собчака отправить Путина в отставку, а прокуратуре поручить расследование. Анатолий Собчак, однако, рекомендацию проигнорировал. А вот о травле Собчака его врагами в фильме упоминается, отмечает журналист.

Для всей страны он был лучом света, говорит в своем интервью Дмитрий Медведев. Но что сказал бы Собчак о сегодняшней российской демократии? — задается вопросом немецкое издание.

СТОП-КАДР

Ванкувер. Канадскія і шведскія балельшчыкі.

23 полицейских пострадали в беспорядках в Афинах

В греческой столице во время беспорядков пострадали 23 полицейских, повреждены витрины магазинов и банкоматы. Об этом сообщили правоохранительные органы страны.

Беспорядки устроила группа из 300 человек, которая примкнула к массовому маршу протеста, проводившемуся в центре Афин в рамках 24-часовой всеобщей забастовки работников государственного и частного секторов. Участники акции, в которой участвовали около 30 тыс. человек, потребовали от правительства переложить бремя выхода из финансового кризиса на "плутократию" и "крупный бизнес".

После марша анархисты, закрывшие лица платками, начали забрасывать кордон спецназа у здания парламента камнями и бутылками с зажигательной смесью. Полицейские применили слезоточивый газ и попытались преследовать нападавших. Последние скрылись на территории афинского университета, куда, по действующему законодательству, вход представителям силовых структур без специального разрешения ректората запрещен.

Самое крепкое в мире пиво

В Шотландии сварено и поступило в продажу самое крепкое в мире пиво — оно крепче водки и виски, поскольку содержит не 40, а 41 алкогольный градус, передает ИТАР-ТАСС. Тем самым работники шотландской пивоварни Brewdog побили рекорд своих немецких коллег из фирмы Schorschbrau, которые несколько недель назад объявили о том, что выпускают на рынок 40-градусное пиво Schorschbock-40.

Пиво крепостью 41 градус продается через сайт компании с доставкой по территории Великобритании. Бутылка в 330 мл обойдется в 40 фунтов стерлингов, плюс семь фунтов за доставку почтой. При этом, сообщает газета The Scottish Sun, германское пиво Schorschbock-40 тоже продается в Шотландии, но стоит 10 ф. ст. за дозу в 25 миллилитров.

В Казахстане тысячи людей эвакуированы из-за паводка

В Алматинской области Казахстана жители ряда сел эвакуированы из-за паводка и угрозы подтопления их домов. Всего были отселены более шести с половиной тысяч человек. Местные власти планируют организовать для эвакуированных людей палаточный городок.

В Дели завершились переговоры между Индией и Пакистаном

Высокопоставленные представители двух стран встречались впервые со времени террористических нападений в индийском городе Мумбае в 2008 году.

В 2008 году Дели прекратил официальные переговоры с Исламабадом, потребовав от него решительных действий против боевиков, укрывающихся на пакистанской территории и причастных, как утверждает Индия, к терактам в Мумбаи, унесшим жизни более 170 человек.

СТАРОНКІ ПАМЯЦІ

Ілля КОПЫЛ

Нябышына. Вайна

Пра Другую сусветную вайну і Вялікую Айчынную як яе частку напісана вельмі шмат, але, па-мойму, аднабакова, скажона і хлусліва, у асноўным пра гераічнае. Пачынаючы з 60-х гадоў мінулага стагоддзя, убачылі свет шматлікія мемуары генералаў і маршалаў — удзельнікаў вайны. Потым мемуары сталі пісаць усе, аж да радавога. З дзесятак тых успамінаў прачытаў і я, але хутка зразумеў, што ўсе яны як блізняты-браты. Гэта голая статыстыка —пералік ваюючых армій з абодвух бакоў і іх камандуючых, колькасць самалётаў і бронетэхнікі, колькасць гармат на адзін кіламетр фронту. Бегства Чырвонай Арміі ў першыя два гады вайны падаецца як запланаваны адыход. У мемуарах я не знайшоў звестак пра колькасць чырвонаармейцаў, што апынуліся ў нямецкім палоне. Такое ўражанне, што ў палоне быў толькі адзін генерал Карбышаў, які гераічна загінуў. У мемуарах не паказаны лёс асобнага чалавека, простага салдата. Толькі мемуары генерала Гарбатава заслугоўваюць увагі. Ён адзіны, хто рызыкнуў расказаць нам пра сталінскія рэпрэсіі, пра катаванні людзей, пра ГУЛАГ.

Памятаю, як у сярэдзіне 70-х гадоў мемуары генерала Гарбатава былі забаронены. У бібліятэку вайсковай часці, дзе я служыў, прыбылі прадстаўнікі Асобага аддзела і ўсе асобнікі кнігі канфіскавалі...

У сваіх нататках, якія я прапаную чытачам "Народнай Волі", я запісаў тыя падзеі ваеннага ліхалецця, якія адбываліся побач са мной, у нашай вёсцы і вакол яе, і тое, што я пачуў ад свайго бацькі і ад аднавяскоўцаў. Я тады быў падлеткам, усім цікавіўся, запамінаў, упітваў у сябе навіны, як губка. Усё, аб чым я пішу, — праўда, пабачаная на свае вочы.



Бацька Іллі Копыла...

1. Перад вайной

Вёска Нябышына, у якой я нарадзіўся і дзе прайшлі мае дзяцінства і юнацтва, уваходзіла ў склад Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (зараз Докшыцкі раён Віцебскай вобласці). На той час гэта была апошняя беларуская вёска перад савецка-польскай мяжой. Наступная вёска — Восава, да якой было 6 кіламетраў, знаходзілася ўжо на польскім баку. Між гэтымі дзвюма вёскамі пралягала савецка-польская мяжа. Вяскоўцы, бывала, парушалі памежную тэрыторыю, натыкаліся на малапрыкметныя сігнальныя прыстасаванні. Але гэта былі не наўмысныя, а выпадковыя парушэнні: збор ягад, рыбоў, арэхаў. Нам пашанцавала, што памежнік Карацупа нёс службу на мяжы з Румыніяй, а не ў нас. У той час мой бацька быў старшынёй калгаса, а гэта на вёсцы галоўная ўлада. Яму часта даводзілася ўладкоўваць канфлікты між памежнікамі і "парушальнікамі" мяжы — вяскоўцамі, і амаль заўсёды ўдавалася іх пагасіць. Памежнікі часта бывалі ў нашай хаце, я іх не палохаўся, яны нават бралі мяне на рукі, заводзілі гульні. Мы да іх прызвычаіліся. У нашай вёсцы не было шпіёнаманіі. Гэта толькі ў кніжках можна прачытаць, што дзеці і дарослыя ў памежных вёсках толькі тым і займаліся, што лавілі "лазутчыкаў". І ўсё-такі чалавек 10—15 нашых вяскоўцаў нкусаўцы забралі. Назад ніхто з іх не вярнуўся.

Мы, дзеці, перад вайной гулялі ў вайну. Зброяй служылі палкі, рагаткі, камяні. Неаднойчы была праліта кроў, былі разбіты насы, галовы, многія не раз хадзілі з сінякамі і гузамі. Ад бацькоў свае раны па магчымасці хавалі. Мы падзяляліся на белых і чырвоных, выбіралі начальнікаў, займалі вызначаныя пазіцыі, і пачыналася бойка. Пацярпелыя (раненыя) не крыўдзіліся.

2. Пачатак вайны

Прыкладна 15 верасня 1939 года ў нашу вёску ўступіла і размясцілася тут вайсковая часць Чырвонай Арміі. Гэта былі вершнікі і нейкі абоз. Іншай тэхнікі: гармат, танкаў, аўтамабіляў — я не бачыў. На нашым гумне, якое пачыналася за хатай, і на выгане за вёскай было пастаўлена шмат палатак. Чырвонаармейцы чамусьці ўсе былі ў касках. У стасункі з вяскоўцамі, нават з намі, дзецьмі, яны не ўступалі, мабыць, каб не выдаць ваенныя сакрэты. Да палатак нас не падпускалі, калі я спрабаваў наблізіцца, вартавы спыняў мяне воклічам: "Стой! Назад!" А мне так хацелася пабываць унутры палаткі. Таму за ўсім гэтым я назіраў праз плот са свайго двара. Мне запомніліся брызентавыя вёдры, з якіх чырвонаармейцы паілі вадой сваіх коней, і круглыя шчоткі для чысткі поўсці. 17 верасня раніцай на зямлю лёг вельмі густы туман, бачнасць была 2—3 крокі. Калі туман праразеў, то я ўбачыў, што наша гумно апусцела. Ні чырвонаармейцаў, ні палатак там ужо не было. Я пабег на тое месца, дзе стаялі палаткі, і знайшоў там з дзесятак драўляных лыжак. Мабыць, чырвонаармейцы іх у спешцы забылі, не заўважылі ў траве і тумане. Лыжкі былі пафарбаваныя ў светла-карычневы колер і пакрыты лакам. Яны былі зусім новыя і пахлі пакостам. Калі мама ўбачыла маю знаходку, чамусьці не абрадавалася, а, наадварот, напалохалася. Яна загадала мне палажыць лыжкі на месца, таму што чырвонаармейцы могуць вярнуцца за імі. Я зрабіў гэта з нежаданнем і вартаваў іх, каб хто іншы не забраў. Але чырвонаармейцам было не да лыжак. Яны пайшлі ў бок мяжы з Польшчай, адна калона — на Гняздзілава, другая — на Восава. Страляніны мы не пачулі, пераход мяжы адбыўся мірна. А тымі лыжкамі, якія я зноў прынёс у хату, уся наша сям'я карысталася вельмі доўга.

Хоць мяжа была ліквідавана, нашым вяскоўцам яшчэ доўгі час не дазвалялася наведаць сваіх сваякоў і знаёмых у Восаве, Докшыцах і ў іншых месцах Заходняй Беларусі. Калі мы, мой тата і я, у першы раз наведаліся ў Восава, то аслупянелі. Мы ўбачылі там чыстую роўную вуліцу, светлыя, добрыя хаты, двары, агароджаныя штакетнікам і прыгожа пафарбаваныя, стрэхі хат пакрытыя чарапіцай ці ацынкаванай бляхай. У нашай савецкай вёсцы Нябышына стрэхі былі саламяныя, двары агароджаны як папала. Мяне больш за ўсё ўразіла тое, што на вуліцы Восава я не ўбачыў кароў і іх ляпёшак. Вуліца ў нашай вёсцы была цалкам забруджана, асабліва раніцай, калі кароў выганялі ў поле. Убачыўшы ўсё гэта, мой бацька сам сабе тады прамовіў: "Вось табе і польскі прыгнёт".

А тое, што заходніх беларусаў нкусаўцы пагналі на расстрэл у Катынь і Курапаты, што заходніх беларусаў эшалонамі адпраўлялі ў савецкі ГУЛАГ за Урал і ў Запаляр'е, ні мой бацька, ні я не ведалі.

Другая сусветная вайна для беларусаў пачалася 1 верасня 1939 года, але мы, усходнія беларусы, гэтага не заўважылі і не адчулі.

3. Новы паварот у вайне

Напрыканцы 1939 года некалькі нашых вяскоўцаў забралі на фінскую вайну, у тым ліку і нашага суседа Косцю Паўловіча. Праз нейкі час ён, паранены і абмарожаны, вярнуўся дадому.

22 чэрвеня 1941 года аб тым, што пачалася вайна, вёска даведалася ад майго бацькі. У той час у нас не было электрычнасці, не было радыё, не было аўтобуснага руху. Адзіны тэлефон быў толькі ва ўправе калгаса. З Бягомля патэлефанавалі, перадалі, што пачалася вайна. Што рабіць, як быць далей, нічога не сказалі, сувязь парушылася і больш яна з раённым цэнтрам не аднавілася. У нашым двары вечарамі сталі збірацца вяскоўцы. Надвор'е было цёплае, але ўсе былі адзеты не па-летняму, быццам бы больш ніколі не вернуцца дадому. Людзі былі напалоханы, гаманілі напаўголаса. Нам, дзецям, было незразумела, чаму дарослыя так напалоханы вайной. Мы ж кожны дзень гулялі ў вайну і нічога жахлівага ў гэтым не бачылі. Мы з цікавасцю яе чакалі разам з дарослымі, каб уключыцца ў гэтую агульную "гульню".

(Працяг на 6-й стар.)

Ілля КОПЫЛ

Нарадзіўся 2 жніўня 1934 года ў вёсцы Нябышына Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (зараз Докшыцкі раён Віцебскай вобласці) у сям'і старшыні калгаса. У 1951 годзе скончыў Нябышынскую сямігадовую школу, у 1954 годзе — Бягомльскую сярэднюю школу.

Пасля заканчэння ў 1957 годзе Мінскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча служыў у Прыволжскай ваеннай акрузе. З 1961 года праходзіў службу ў ракетных войсках стратэгічнага назначэння СССР. У снежні 1981 года звольнены ў запас.

З 1983-га па 1997 год працаваў прадстаўніком ваеннага ведамства на Мінскім электрамеханічным заводзе.

У студзені 1990 года вылучаўся кандыдатам у дэпутаты Мінгарсавета. Зараз на пенсіі.

У час вайны сям'я Копылаў знаходзілася на акупіраванай тэрыторыі. Успаміны аўтара пра апаленае вайной дзяцінства сталі асновай дадзенай публікацыі.

www.kamunikat.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
26 лютага—1 сакавіка 2010 г.

Нябышына. Вайна

(Працяг. Пачатак на 5 стар.)

Можа, праз два-тры дні сталі чутны выбухі і былі бачны трывожныя зарніцы ў напрамку Докшыц. Потым гэтыя выбухі сталі перасоўвацца на поўнач, паўночны ўсход і зусім заціхлі дзесьці на ўсходзе. Бацька называў невядомыя мне гарады — Полацк, Віцебск, Лепель, Барысаў, куды, на яго думку, пасунуўся фронт.

У 1941 годзе мы так і не адчулі, што такое вайна. Мужчыны ўсе засталіся дома, на вайну нікога не забралі, мабілізацыя спазнілася. Апынуліся на вайне толькі тыя вяскоўцы, якія ў гэтыя дні былі па нейкіх справах у раённым цэнтры Бягомлі. Іх там проста пахапалі і павезлі на Барысаў. Сярод іх апынуўся і наш сусед Зміцер Маскалейчык, шафёр калгаснай палутаркі. Ён прайшоў амаль усю вайну і толькі ў канцы быў лёгка паранены.

Так склаліся абставіны, што праз нашу вёску ў 1941 годзе не адступала Чырвоная Армія, не наступалі немцы, не ішлі натоўпы бежанцаў, не гналі статкі буйной рагатай жывёлы на ўсход, каб яны не дасталіся ворагу. Нашу вёску не бамбілі, не абстрэльвалі з гармат, немцы не ўрываліся ў нашы хаты, нікога не забівалі, не рабавалі, не гвалтавалі. І калі, будучы дарослым, я чытаў творы пра вайну, бачыў кінастужкі, мая свядомасць уступала з гэтым у супярэчнасць. Я пражыў усю вайну ў акупацыі і добра ведаў, як усё адбывалася ў асобна ўзятай вёсцы.

4. Роспуск калгаса

Фронт адсунуўся далёка на ўсход, а ў глыбокім тыле ў немцаў засталася наша вёска і некрануты, неразрабаваны калгас "Чырвоны расцвет", і старшынёй гэтага калгаса заставаўся мой бацька — Піліп Гіляравіч Копыл. Трэба адзначыць, што афіцыйна яго прозвішча па бацьку было Іларыёнавічам. Калі расейцы ў XIX стагоддзі перапісвалі нашу вёску, то іх чыноўнікам не падабалася імя майго дзеда — Гілярый і яго перайменавалі ў Іларыёна. Відаць, гэта быў пачатак русіфікацыі ў нашай вёсцы, такіх перайменаванняў было шмат.

На пачатку вайны калгаснікі па-ранейшаму хадзілі на працу. Трэба было даглядаць скаціну. У калгасе былі коні, каровы, авечкі, свінні. Малако здаваць не было куды, ім кармілі парасят, цялят, раздавалі калгаснікам. Ураджай у 1941 годзе ўрадзіўся небывалы, жыта шугала вышэй чалавечага росту.

Напрыканцы чэрвеня (а можа, на пачатку ліпеня) нарэшце ў нашу вёску завіталі прадстаўнікі нямецкай адміністрацыі: валасны староста і нямецкі афіцэр з перакладчыкам. Яны прыехалі на легкавой машыне. Іх суправаджала ахова з 6 чалавек на 2-х матацыклах з калясками. Валасны староста выклікаў майго бацьку і загадаў сабраць людзей на сход. Вёска Нябышына ў той час налічвала 120 двароў і была падзелена на дзве часткі шашой Бягомль—Докшыцы. Бацька адразу паслаў некалькі юнакоў у абодва бакі вёскі, каб заклікаць людзей на сход. Праз хвілін 15—20 усе вяскоўцы былі ў зборы, прайшлі сем'ямі, нават з дзецьмі. І мяне, сямігадовага хлапчука, мой бацька ўзяў з сабой. Сход адбыўся на вуліцы, клуба ў вёсцы не было, а школа згарэла да вайны.

Спачатку нямецкі афіцэр даводзіў да нас ваеннае становішча. Ён сказаў, што Мінск вызвалены ад камуністаў, нямецкая армія пад Смаленскам. Ён павіншаваў і нас з вызваленнем. Людзі стаялі моўчкі. Потым дайшоў да пытання прызначэння старасты. Хтосьці з натоўпу крыкнуў: "Няхай старастай будзе старшыня калгаса Піліп Гіляронак. Кіраваць людзьмі — для яго справа звыклая". Я з гонарам паглядзеў на бацьку, але на яго твары ўбачыў жах і разгубленасць. Нямецкі афіцэр і валасны староста параіліся паміж сабой і аб'явілі, што старшыню калгаса прызначаць старастай немэтазгодна і для яго самога — небяспечна. Потым мой бацька казаў, што ён перажыў самы крытычны, самы небяспечны, самы жахлівы момант у сваім жыцці. Ён з цеплынёй успамінаў таго нямецкага афіцэра, які ўратаваў яго ад немінучай смерці, не прызначыўшы старастам. Праз нейкі час па беларускіх вёсках пачалі шастаць карнікі атрадаў асобага прызначэння НКУС СССР. Адным з такіх атрадаў камандаваў Вауншасаў. Яны расстрэльвалі ўсіх, хто, каб пракарміць свае сем'і, уладкаваўся на працу да немцаў. Гэта былі медработнікі, настаўнікі, інжынеры, журналісты, артысты, кухары і вялікі шэраг іншых. Галоўнай жа мішэнню былі старасты.

А старастам нашай вёскі на тым сходзе прызначылі Кастуся Шульгата. Гэта быў статны, высокі, шырокаплечы мужчына, які выдзяляўся ў натоўпе. Таму, відаць, немцы і звярнулі на яго ўвагу. Гэта быў вельмі сціплы, бяскрыўдны чалавек. Адказацца ад пасады было немагчыма, перад намі былі акупанты, хоць і паводзілі яны сябе міралюбна, але чакаць можна было ўсяго.

Прызначыўшы старасту, немец абвясціў аб роспуску калгаса. Коні, інвентар, зямля вярталіся іх уладальнікам — сялянам. Калгас распаўся на 120 індывідуальных гаспадарак. Нягледзячы на тое, што ўжо быў прызначаны староста, дзяліць калгас загадалі майму бацьку. Я не буду апісваць, як адбывалася гэта складаная справа. Яна працягвалася шмат дзён. Трэба было ўсё ўлічыць, нікога не пакрыўдзіць. З гэтай задачай мой бацька справіўся паспяхова, бо ніхто з вяскоўцаў не паскардзіўся на яго новай уладзе.

Куды падзяваліся каровы, свінні, авечкі, не памятаю, прашляпіў. Хутчэй за ўсё цалкам забралі немцы. Калі надышоў час дзяліць калгасных коней, бацька ўзяў з сабой і мяне. Дзялілі па жэрабі. Калі падышла чарга майго бацькі цягнуць жэрабя, ён даручыў гэта мне. Бацька разгарнуў скручаную паперку, якую я выцягнуў, і з радасці пачаў скакаць. Нам выпаў самы лепшы калгасны конь. Ён быў малады, але ўжо аб'езджаны, белай масці. Нам зайздросцілі, а я вельмі ганарыўся. Бацька адзеў на Бялька аброць, перадаў павадок у мае рукі і прамовіў: "Ну, гаспадар, вядзі каня дадому". У вёсцы той выпадак памятаюць і зараз. У лютым месяцы 1942 года ў нас каня ўкралі. Бацька аднёс заяву ў нямецкую камендатуру ў Докшыцы. Праз два дні немцы каня знайшлі і вярнулі яго нам.

5. Першая сустрэча з немцамі

У адзін з ліпеньскіх дзён, на пачатку месяца, мы, вясковыя падлеткі, купаліся і загаралі на пясчаным беразе ракі Поні ў 100 метрах ад моста. Нечакана мы ўбачылі, што з боку Докшыц рухаецца аўтамабільная калона, машын 10—15. Яна мінавала вёску і накіравалася ў наш бок да моста. На першай машыне справа спераду над кабінай развяваўся чырвоны сцяг. Хтосьці крыкнуў: "Нашы!" — і цераз мост мы пабеглі насустрач. Перад мостам калона спынілася. Мы ўбачылі, што гэта немцы. Яны выйшлі з пярэдняй машыны і са словамі: "Гут, гут", — па-сяброўску хлопалі па нашых голых спінах. Мы асмялелі, палезлі на падножкі, адчынілі кабіну, націскалі на клаксон, сігналілі. Такія велізарныя машыны мы бачылі ўпершыню. У нашым калгасе была ўсяго адна грузавая машына ГАЗ-АА1 — палутарка. Немцы не сварыліся на нас, з цікавасцю нас разглядалі і сталі частаваць шакаладам, які мы таксама бачылі ўпершыню. Я быў менш бавіты, апынуўся ў хвасце і мне шакаладу не дасталося. Было крыўдна, на вачах накаціліся слёзы. Убачыўшы гэта, адзін немец дастаў з кішэні губны гармонік і падарыў мне. Потым немцы паказалі рукамі, каб мы вярталіся назад на бераг ракі: "Шнэль, шнэль". Мы пабеглі, а калона прадоўжыла рух у бок Бягомля.

6. Хрышчэнне

Хтосьці распусціў чуткі, што немцы будуць караць тых, хто не хрышчаны. У нашай вёсцы няхрышчанымі былі ўсе дзеці. Я нават не ведаю, ці была да вайны хоць адна дзеючая царква ў Бягомльскім раёне. Хачу сказаць, што на самай справе немцы не займаліся высвятленнем, хто хрышчаны, а хто не. Аднак, далей ад ліха, мой бацька праявіў ініцыятыву і прывёз з Докшыц святара. Усіх нас, нехрысцяў, сабралі ў адной хаце і пахрысцілі. Я памятаю, як той абрад адбываўся. На падлозе ў цэнтры хаты паставілі кадку з калодзежнай вадой. На дне кадкі ляжаў крыж. Нас паставілі ў кола вакол кадкі. Святар чытаў малітву, макаў пальцы ў ваду, а потым кожнага з нас мазаў па лбе. Нацельных крыжыкаў нам не далі. Прыкмет, хрышчоны ты ці не, у нас не засталося. Але ў мяне з'явілася хросная мама. Неўзабаве ў суседняй вёсцы Вітунічы адчынілася царква. Раней у яе памяшканні было збожжасховішча. Аднойчы мама ўзяла з сабой у царкву і мяне.

7. Першы раз у першы клас

2 жніўня 1941 года мне споўнілася 7 гадоў, трэба было рыхтавацца да школы. Бацькі, не толькі мае, непакоіліся, ці будуць працаваць школы ва ўмовах акупацыі. Але ўсё склалася найлепшым чынам. У жніўні ў нашу вёску наведаліся дзве жанчыны з валасной управы і ўзялі на ўлік усіх дзяцей школьнага ўзросту. Мой бацька яшчэ да вайны набыў мне буквар, сшыткі, алоўкі.

Як я ўжо згадваў, наша школа згарэла ў студзені 1940 года. Для малодшых класаў пабудавалі хату-пяцісценку. Астатнія дзеці хадзілі ў школу за 2 кіламетры ў суседнюю вёску Вітунічы. Такі ж парадак застаўся і пры немцах.

1 верасня 1941 года я пайшоў у першы клас. Ніякай нацысцкай прапаганды ў школе не вялося. Настаўніца ні разу не называла ўслых прозвішчы фашысцкіх правадыроў Гітлера, Гебельса, Герынга. Яна нас проста вучыла чытаць, пісаць і лічыць. Прадстаўнікі нямецкай адміністрацыі ні разу не наведалі школу, каб пракантраляваць навучальны працэс. Але вучыцца нам давялося нядоўга. У лістападзе (зямля ўжо была падмарожана, але снег яшчэ не выпаў) да школы падышла група ўзброеных людзей. Школа стаяла асобна, крыху ўбаку ад вёскі, і падысці да яе можна было непрыкметна з боку могілак. Гэта былі чырвонаармейцы, адстаўшыя ад фронту. Іх шмат блыталася ў навакольных лясах. Яны былі брудныя, абадраныя, няголеныя, навялі на нас жах. Магчыма, яны шукалі ежу. У клас увайшлі трое, астатнія засталіся на вуліцы. Яны былі вельмі здзіўлены — ідзе вайна, немцы пад Масквою, а тут, як ні ў чым ні бывала, у школе ідуць заняткі! Такое дапусціць нельга. Адзін з іх, магчыма, старэйшы, схапіў настаўніцу за грудкі і закрычаў ёй у твар: "Ты фашысцкая прыслужніца, здрадніца!" — і штосьці яшчэ. Потым ён успомніў пра нас і па-драпежніцку закрычаў: "А вы, фашысцкія ўблюдкі, марш дадому і каб вашага духу тут больш не было!" Яны размаўлялі па-руску. Можна сказаць, што гэта быў для нас першы ўрок рускай мовы і апошні ўрок заняткаў у школе. Мы, напалоханыя, пабеглі дадому, кінуўшы ў школе сваё адзенне, буквары, пісьмовыя прылады. Больш мы ў школу не пайшлі, было небяспечна. Што здарылася з настаўніцай — не ведаю.

У Вітунічах школа працавала да канца вучэбнага года.

8. Прымакі

"Пайшоў у прымы", — так у нашай вёсцы казалі пра мужчыну, які пасля шлюбу ішоў жыць у хату жонкі, ці ў хату бацькоў жонкі. Але я хачу расказаць зусім пра іншы, нечаканы выпадак.

У жніўні 1941 года праз нашу вёску ўбок Докшыц немцы гналі невялікую калону палонных чырвонаармейцаў, чалавек сто. У вёсцы яны прыпыніліся на гадзіну, каб адпачыць. Палонныя і канваіры размясціліся на зялёным лужку школьнай тэрыторыі. Навіна гэта абляцела вёску, і хутка сюды сабралася шмат вяскоўцаў, прынеслі з сабой ежу, у каго што было на той момант. Людзі спакойна раздавалі палонным хлеб, вараную бульбу, сала, сыр, малако, яйкі, гародніну. Гэтым жа самым частавалі і немцаў-канваіраў. Хтосьці прынёс вядро вады і конаўку. Што цікава, немцы нікога не штурхалі, не праганялі, не крычалі, як гэта я неаднойчы бачыў у савецкіх пасляваенных кінастужках. У канваіраў нават аўчарак не было.

Калі адпачынак закончыўся, палонных пастроілі, нямецкі афіцэр звярнуўся да жыхароў вёскі: "Каму для ўласнай гаспадаркі патрэбны работнікі, можаце браць палонных у свае сем'і". Але мае аднавяскоўцы не рынуліся ратаваць палонных. Я не ведаю, як гэта патлумачыць. Магчыма, у першы год вайны мы яшчэ не ўбачылі, не адчулі яе жахаў і лічылі, што палонным нічога не пагражае. А можа, людзі не забыліся, як пры савецкай уладзе тых, хто карыстаўся працай батракоў, выслалі ў Сібір, і таму зараз праявілі асцярожнасць? І толькі тры ці чатыры незамужнія, а можа, удовыя жанчыны спрактыкаваным вокам выбралі сабе мужыкоў. Прывяла да сябе ў хату прымака і наша суседка. Ён быў прыгожы, статны мужчына. Яго звалі Фёдарам, родам з Украіны. Я пабег з ім знаёміцца, ён размаўляў са мной, як з дарослым. Адзін раз на месяц Федзя хадзіў у воласць адзначацца. У вёсцы прымакі пражылі да 1943 года. Калі партызаны зрабілі наша жыццё нязносным, усе яны пайшлі ў партызаны, а затым — у Чырвоную Армію. Пасля вайны яны вярнуліся ў Нябышына, каб забраць на Украіну сваіх выратавальніц. Але толькі Фёдар увёз з сабой нашу суседку. Яна прыслала з Украіны некалькі пісем. Фёдар пабудаваў для яе хату побач са сваёй. Сам ён быў жанаты, але яго жонка прыняла нашу зямлячку сардэчна, яны сталі сяброўкамі.

(Працяг будзе.)

Все — на тест!

Министерство образования утвердило график проведения централизованного тестирования в 2010 году.

Первое испытание — по белорусскому языку — пройдет 14 июня. 15 июня абитуриенты сдадут русский язык, 17 июня — историю Беларуси, 18 июня — географию, 20 июня — математику, 22 июня — обществоведение, 24 июня — Всемирную историю новейшего времени, 25 июня — физику, 27 июня — биологию, 29 июня — иностранные языки, 30 июня — химию. Все испытания традиционно будут начинаться в 11.00.

Резервный день для тех, кто не смог по объективным причинам прибыть на централизованное тестирование по графику, — 5 июля.

Газ адаб'ецца на цэнах

Паводле пастановы №39 Міністэрства эканомікі Беларусі на 25% павысіўся кошт газу, які прадаецца юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам.

Неабходнасць павышэння кошту газу ў ведамстве патлумачылі "ростам кошту газу, які купляецца ў Расійскай Федэрацыі, а таксама зменамі агульных эканамічных умоў гаспадарання".

1 тысяча кубаметраў газу да падаражання каштавала для прадпрыемстваў 174 долары, зараз будзе каштаваць 217 долараў. Кошт газу для насельніцтва пакуль не змяніўся.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Когда ждать «Мотор-шоу 2010»?

С июня этого года белорусских автомобилистов ждут большие перемены. Я всегда был поклонником авто, особенно дорогих и красивых. Но из-за изменений закона я боюсь, что могу лишиться своего любимого развлечения — выставки "Мотор-шоу". Все-таки это единственная автовыставка в Минске, а на их сайте нет никакой информации…"

Сергей, 27 лет, Минск.

Опасения по поводу отмены или переноса излюбленного зрелища всех поклонников автомобилей на самом деле не беспочвенные. Спешим успокоить всех тех, кто ждет очередную выставку "Мотор-шоу", — в этом году она состоится. Изменились лишь сроки: она будет проходить с 21 по 26 сентября.

Решение о переносе "Мотор-шоу" связано с принятием нового закона о взимании таможенных пошлин для юридических и физических лиц на ввоз автомобилей в Беларусь. Концепция выставки останется прежней — на ней будут собраны все автоновинки, зрителей ждет шоу-программа и традиционные конкурсы и розыгрыши призов. Согласно замыслу организаторов, перенос "Мотор-шоу" на более поздние сроки даст возможность сделать выставку более эффективной как для участников, так и для посетителей.

Мария МАЛЕВИЧ.

НЕДВИЖИМОСТЬ

Квартиры будут дорожать?

Согласно мониторингу рынка недвижимости, проведенному специалистами ГУП "Национальное кадастровое агентство", в кризисный 2009 год в Беларуси было продано квартир не меньше, чем в предыдущем.

Общая сумма сделок составила примерно 700 млн долларов. Причем, например, в Минске, согласно эти данным, количество сделок на вторичном рынке жилья превысило показатель предыдущего года на 4%, а 2007-го — на 14%.

Согласно данной статистике, больше всего квартирных сделок происходило в Минске. Всего в Беларуси в 2009 году было продано и куплено почти 29,5 тыс. квартир, из них едва ли не половина в Минске — 10.581 квартира. Причем минчане одинаково охотно покупали и однокомнатные, и двухкомнатные апартаменты. Что особо обращает внимание — 39% покупок совершалось в домах, построенных после января 2000 года. Хотя, собственно, удивляться нечему: Минск — самый большой по населению город Беларуси.

— *Если честно, сложно комментировать такую статистику,* — говорит риэлтор столичного агентства "Евронедвижимость" **Дмитрий Кухаревич**. — *Многочисленные мониторинги, проводимые на протяжении года, свидетельствовали о падении объема сделок на рынке жилья. Особенно, когда выросли ставки по кредитам, потому что более половины квартир в Беларуси приобретаются в кредит.*

Безусловно, прошлый год был отмечен падением цен на жилье. Но в это же время падали доходы населения, и, следовательно, падал спрос на квартиры.

Будет ли дешеветь жилье в этом году или, наоборот, есть предпосылки для увеличения стоимости квартир?

— *Не думаю, что ситуация на рынке недвижимости в 2010 году будет сильно отличаться от той, какая была в прошедшем году,* — считает Дмитрий Кухаревич. — *Возможно, будет небольшой рост числа сделок, но, полагаю, что и цены на квартиры будут потихоньку расти и за год поднимутся в цене на 10 процентов.*

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

І ТАКОЕ БЫВАЕ...

Пенсіянер з Віцебшчыны стаў «народным дэтэктывам»

71-гадовы Веніямін Марозаў з Гарадка атрымаў каштоўны падарунак і званне "народнага дэтэктыва" ад УУС Віцебскага аблвыканкама. Пенсіянер уласнаручна злавіў дзвюх цыганак, што на працягу двух гадоў рабавалі пенсіянераў.

Зладзейкі залезлі ў хату спадара Марозава, калі таго не было дома. Але, на шчасце, ён вярнуўся, калі цыганкі ўжо выходзілі з хаты, напакаваўшы вялізныя сумкі. Пенсіянер не толькі адабраў сваё дабро, але і затрымаў іх да прыезду міліцыі, пагражаючы газавым балончыкам.

ДЗІКУНСТВА!

Як «сын» забіў «бацьку»

І блізка не падпусціў бы да сябе юнака-сірату, выпадкова сустрэтага ў Віцебску, грамадзянін Расіі, 50-гадовы Мікалай Шашкоў, калі б хоць на момант мог уявіць, чым абернецца для яго спагадлівасць да нядаўняга дзетдомаўца Віталя (пакуль справа не дайшла да суда, назавём яго так). Паверыўшы скаргам хлопца на гаротны лёс і хранічную нішчымніцу, чуллівы расіец даў юнаку прытулак у сваёй хаце, набытай у вёсцы Біцялёва пад Віцебскам, паставіўся да Віталя сапраўды па-бацькоўску: карміў, апранаў, забяспечваў грашыма на розныя надзённыя патрэбы. Нават, пахадзіўшы па дзяржаўных інстанцыях, "прабіў" свайму падапечнаму сацыяльнае жыллё ў горадзе. Толькі вось, на жаль, не пацікавіўся ў "сына", чаму той кінуў працу на прадпрыемстве і завёў хаўрус з пітушчымі лайдакамі, схільнымі да крыміналу. А калі паводзіны "прыёмыша" ў дачыненні да наіўнага апекуна перайшлі ад першаснай удзячнасці да патрабавальнага нахабства, Шашкоў адчуў няладнае, ды было позна: у Віталя ўжо выспеў план забойства і рабавання чалавека, якога сам каля трох гадоў называў татам.

Каб хутчэй і прасцей ажыццявіць задуманае, Віталь запрасіў на дапамогу 32-гадовага беспрацоўнага жыхара Віцебска, які напачатку быццам бы павагаўся, але, убачыўшы прадбачліва набытую Віталем пляшку гарэлкі, даў згоду на ўдзел у злачынстве.

Выпіўшы бутэльку на дваіх для імпэту, злодзеі дачакаліся ночы і рушылі ў Біцялёва.

Пачуўшы за дзвярыма голас Віталя, Мікалай Шашкоў даверліва пусціў у хату абодвух маладзёнаў і нават пачаставаў іх каньяком.

Пакуль госці, выпіўшы па келіху, вялі нягучную размову, гаспадар пайшоў спаць.

Прачнуўся Мікалай ад таго, што нехта рыпнуў дзвярыма пакоя. Гэта быў Віталь. Ён папрасіў у "бацькі" цыгарэту. Шашкоў ледзь паспеў дастаць пачак цыгарэт, як "сынок" з усяе сілы абрынуў на галаву апекуна сякеру. Віталь адразу ж паклікаў хаўрусніка, і ўдваіх злачынцы дабілі гаспадара, знялі з нябожчыка залатыя ўпрыгажэнні, адшукалі і забралі ўсе грошы, якія былі пры забітым і ў хаце, а труп гаспадара скінулі ў падполле.

Ведаючы, што Мікалай Шашкоў як прафесійны кухар раз-пораз выязджае з Віцебска ў Расію на часовую працу, ягоная сястра не адразу напалохалася, калі, прыехаўшы да Мікалая ў Біцялёва, не сустрэлася з блізкім чалавекам. Віталь, якога прыезджая добра ведала, праўды, канешне, не сказаў. Спачатку хлусіў, што "бацька" з'ехаў у Расію, потым — што ён захварэў і трапіў у рэанімацыю.

У рэшце рэшт кабета занепакоілася і звярнулася ў міліцыю. Неўзабаве абодвух забойцаў адшукалі і затрымалі.

Як паведаміў следчы па крымінальных справах Віцебскай абласной пракуратуры Уладзімір Байданаў, падазроным у карыслівым забойстве і рабаванні пагражае максімальная мера пакарання — пажыццёвае зняволенне альбо расстрэл.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

БУДЗЬ ЗДАРОЎ!

10 парад, як не паддацца старэчаму маразму

Вы забываеце словы, рэчы? Вы не можаце сканцэнтраваць сваю ўвагу? Што рабіць, каб не паддацца старэчаму маразму? 10 парад прапануе доктар Рычард Рэстак — прафесар неўралогіі Медыцынскага цэнтра Джорджа Вашынгтона ў ЗША, аўтар двух дзесяткаў папулярных кніг, прысвечаных вывучэнню мозгу.

Доктар кажа, што ўсе гэтыя парады ўключыў у сваё асабістае жыццё і можа пацвердзіць іх эфектыўнасць.

Навучыцеся аднаму новаму слову кожны дзень. Гэта складзе больш за 350 слоў за год, або 3000 слоў за дзесяцігоддзе. Гэта нядрэнна, бо функцыянальная лексіка дарослага чалавека складае ўсяго 10 тысяч слоў! Запамінанне словаў, як выявілі навукоўцы, развівае моўныя цэнтры мозгу і з'яўляецца свайго роду мазгавой аэробікай.

Гуляйце ў відэагульні. Калі разумна выкарыстоўваць відэагульні, яны павысяць вашу сенсорную адчувальнасць і хуткасць рэакцыі.

Цаніце мастацтва. Музыка павышае лексічна-моўную шкалу. Інструментальная музыка спрыяе трэніроўцы мозгу. Калі вы самі граеце на музычным інструменце, у дадатак у вас павышаецца спрытнасць пальцаў, што павышае даўгавечнасць.

Хадзіце на прагулкі. Штодзённая прагулка ўсяго на адну мілю — а гэта недзе паўтара кіламетра — змяншае імавернасць развіцця старэчай слабасці розуму на 50 працэнтаў.

Выпрабоўвайце сябе. Перастаньце лічыць, што ваш інтэлект — гэта нешта, з чым вы нарадзіліся і што не можаце змяніць. Новыя даследаванні паказваюць, што пастаяннае азадачванне свайго мозгу новымі праблемамі — ад разгадкі крыжаванак да запамінання спісу патрэбных прадуктаў — павялічвае ваш інтэлект.

Падтрымлівайце здаровую вагу. Было выяўлена, што атлусценне — адзін з асноўных фактараў, які пазней вядзе да маразму. Атлусценне прыводзіць да зніжэння ўсіх функцыянальных здольнасцяў чалавека, у тым ліку і інтэлекту.

Ешце грэцкія арэхі і чарніцы. Грэцкія арэхі сярод іншых карысных рэчываў утрымліваюць 3-амегакіслоты, якія дзейнічаюць як магутныя антыаксіданты. Чарніцы таксама спрыяюць мазгавой актыўнасці.

Апантана захапіцеся нейкай ідэяй. Калі нейкая праца ці хобі моцна вас захопіць, пастарайцеся даведацца на гэтую тэму як мага больш, так, каб дасягнуць узроўню эксперта. Гэта павялічыць вашы рэзервы, доўгатэрміновую памяць. Інвестуючы ў пашырэнне вашага мозгу, вы пабудуеце ўласную базу ведаў, якая, падобна як валютныя рэзервы, будзе вашым апірышчам у старасці.

Гуляйце ў складанку Jenga. Тут доктар мае на ўвазе папулярную гульню на хуткасць складання вежы з драўляных брусочкаў. Дапамогуць і іншыя галаваломкі або нават жангліраванне. Гэта дапамагае распрацоўваць тыя часткі мозгу, якія адказныя за візуальныя складнікі рухаў.

І ўрэшце, перадыхніце днём. 20-хвілінная перадышка днём, калі вы, як кажуць, прыкарнулі і заснулі ненадоўга, палепшыць вашу памяць настолькі, як калі б вы спалі цэлую ноч. Дзённая перадышка таксама павышае настрой, канцэнтрацыю ўвагі і творчы патэнцыял.

Людзі гінуць за… царкву

На будоўлі праваслаўнага храма, які ўзводзіцца ў Брэсце на вуліцы Беларускай, у выніку падзення з пляцоўкі пад'ёмніка загінуў настаяцель і атрымаў цялесныя пашкоджанні прыхаджанін.

Як паведаміў БелаПАН следчы пракуратуры Ленінскага раёна Брэста Аляксей Ярошык, трагедыя здарылася ў другой палове дня 24 лютага ўнутры царквы. Вядома, што 58-гадовы настаяцель храма і 42-гадовы прыхаджанін стаялі на перасоўнай пляцоўцы будаўнічага стоечнага пад'ёмніка.

Паводле папярэдніх звестак, абарваўся металічны трос пляцоўкі, якая разам з людзьмі ўпала з вышыні.

Настаяцель храма загінуў на месцы. Прыхаджанін шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Праверку па гэтым факце праводзіць пракуратура Ленінскага раёна Брэста.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 лютага—1 сакавіка 2010 г.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 1 МАРТА

Первый

03.25 “Олимпийские игры. Ванкувер-2010”. Церемония закрытия. Прямая трансляция.
05.30 “В ожидании Мундиаля”.
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.15 “Новости”.
06.05, 07.10, 08.15 “Доброе утро, Беларусь!”.
07.05, 08.10, 18.50, 00.20 “Зона Х”.
07.30, 08.25, 11.50 “Деловая жизнь”.
08.30 “В мире моторов”.
09.05 “Nota Bene”.
09.35 “Звездные танцы. Мужской сезон”.
11.00, 17.05 “Не родись красивой”. Сериал.
12.10, 18.25 “Дневник Олимпиады”.
12.35 “ЛопуХИ”. Худ.фильм.
14.05 “Жизнь как жизнь”.
15.15, 19.15 “Новости региона”.
15.25 “Культурные люди”.
15.55 “Сестры по крови”. Сериал.
18.05 “Легко сказать. Ольга Кобякова”.
19.25 “КЕНО”.
19.30 “Арена”.
19.55 “Ответный ход”.
21.00 “Панорама”.
21.55 “Специальный репортаж”.
22.05 “Олимпийские игры. Ванкувер-2010”. Церемония закрытия.
00.25 “День спорта”.

ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 00.40 “Наши новости”.
06.05 “Наше утро”.
09.05 “Контуры”.
10.10 “Дыхание планеты”.
10.45, 11.10 “Великолепная пятерка”.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 00.55 “Новости спорта”.
12.00 “Малахов +”.
13.10 “Понять. Простить”.
13.40 “Модный приговор”.
14.45 “Контрольная закупка”.
15.15 “Виола Тараканова. В мире преступных страстей”. Сериал.
16.15 “Монтекристо”. Сериал.
18.20 “Моя прекрасная няня”. Сериал.
19.00 “Жди меня”.
20.00 “Время”.
21.05 “Выбор”.
22.00 “Наши в Осло. Группа “3+2”.
23.25 “Преступления века”.
23.55 “Женаты... с детьми”. Сериал.

РТР-Беларусь

07.00 “Утро России”.
09.20, 19.30 “Однажды будет любовь”. Сериал.
10.10 “Наука выживать. Евгений Тарле”. Док.фильм.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 “Вести”.
11.25 “Утренняя почта”.
11.55 “Случайный попутчик”. Худ.фильм.
13.50, 16.50, 18.50, 00.05 “Новости — Беларусь”.
14.25, 23.00 “Две стороны одной Анны”. Сериал.
15.15 “Из жизни начальника уголовного розыска”. Худ.фильм.
17.15 “Кулагин и партнеры”. Сериал.
17.45 “Кармелита. Цыганская страсть”. Сериал.
20.30 “Крем”. Сериал.
22.25 “Дворик”. Сериал.
23.50 “Ничего личного”.
00.15 “Обвиняется Чарльз Дарвин”. Док.фильм.

НТВ-Беларусь

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15 “Сегодня”.
07.05 “Сегодня утром”.
08.30 “Чрезвычайное происшествие. Обзор за неделю”.
09.00 “Программа максимум”.
10.20 “Следствие вели...”.
11.05 “Кулинарный поединок”.
12.05 “МУР есть МУР!-2”. Сериал.
13.30 “Территория красоты”. Сериал.
15.05 “Средний класс”.
15.35, 18.35 “Обзор. Чрезвычайное происшествие”.
16.30 “Возвращение Мухтара-2”. Сериал.
19.35 “Глухарь. Продолжение”. Сериал.
21.35 “Тюрьма особого назначения”. Сериал.
23.40 “Честный понедельник”.
00.30 “Школа злословия”.

СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 “24 часа”.
06.10, 17.20 “Минщина”.
06.20, 07.45 “Утро. Студия хорошего настроения”.
07.40, 20.10 “СТВ-спорт”.
08.30 “Неделя”.
09.35 “Большой завтрак”.
10.05 “Пять историй”.
10.40 “Ангел-хранитель”. Сериал.
11.40, 17.30 “Званый ужин”.
12.35, 18.30 “Бывшая”. Сериал.
13.50 “Звездный ринг”.
15.00 “Большой город”.
15.30 “Горячий лед”.
16.00 “Культурная жизнь”.
16.50 “Я — путешественник”.
17.10 “Наше дело”.
20.00, 22.55 “Столичные подробности”.
20.20 “Добрый вечер, малыш!”.
20.40 “А я люблю женатого”. Худ.фильм.
23.00 “Столичный футбол”.
